НЕ ЗАДЕРЖИВАЙ ГАЗЕТЫ

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletariusze wszystkich krajów, połączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

# САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ЦЭНТРАЛЬНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І СОВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПАНЯДЗЕЛАК
15 чэрвеня 1931 г.
№ 135 (3224)

# За мільён тон—у бой!

Сіласная кампанія — важнейшае зьвяно ў рэканструкцыі жывёлагадоўлі. Сіласаваньне кармоў, адзін з важнейшых сродкаў стварэньня магутных кармовых рэзэрваў, у масавым маштабе мы пачалі праводзіць толькі ў мінулым годзе. Запоўненыя зялёнай масай тысячы ям і траншэй далі нам вялікую колькасьць добрага корму, і ў тых раёнах, дзе сіласная кампанія была праведзена добра, сілас значна паслабіў кармовыя цяжкасьці. І ў гэтым сэнсе вынікі леташняй сіласнай кампаніі граюць ролю добрага агітатара за сілас.

Ямы і траншэі поўнасьцю апраўдалі тое давер'е, якое ім было аказана. Пад абарону сіласных ям, траншэй і вежаў нам удалося паставіць у мінулым годзе значную колькасьць галоў жывёлы.

У бягучым годзе сілас павінен адыграць яшчэ большую ролю. Растучая буйнымі тэмпамі жывёлагадоўля настойліва патрабуе разгортваньня рашучай барацьбы за магутную кармовую базу. У гэтай барацьбе сілас—важнейшае зьвяно.

Праграма сіласаваньня кармоў у бягучым годзе вызначана ўрадам у мільён тон зялёнай масы. Мільён тон добрага, сакавітага корму павінны атрымаць пашы стады ў гэтым годзе.

Мы нядаўна падводзілі вынікі мінулага стойлавага перыяду. Мы адначалі выключную напружанасьць кармовага балянсу мінулага году. Здавалася-б, вурокі мінулай зімы павінны былі шмат чаму навучыць нашы РВК і сельсаветы, кіраўнікоў саўгасаў і калгасаў. Здавалася-б, што ў гэтым годзе сіласная кампанія будзе па сапраўднаму стаяць у цэнтры ўвагі бягучай сельска-гаспадарчай кампаніі. Між тым, той факт, што мы на сёньняшні дзень выканалі плян сяўбы сіласных культур толькі на 19,2 проц. красамоўна сьведчыць аб тым, што ў навучаньні — недаацэнка значэньня кармовай праблемы. Мы павінны з усёй сілай падкрэсьліць тое, што ў нас ёсьць усе магчымасьці для стварэньня сталай кармовай базы жывёлагадоўлі і што цяжкасьці з кармамі, якія мы адчуваем амаль штогод, вынікаюцца выключна вынікам недаацэнкі важнасьці гэтае справы, вынікам сыстэматычнага спазьненьня ў правядзеньні неабходных мерапрыемстваў. На гэтай недаацэнцы трэба рашуча і бязьлітасна біць. На барацьбу з ёю трэба па сапраўднаму мабілізаваць шырокія масы рабочых саўгасаў, калгаснае сялянства і мільёны беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў.

Мы патрабуем, каб плян пасеву сіласных культур быў выкананы цалкам. Час яшчэ не прапушчан. Сеяць яшчэ можна. Пры максымальным напружаньні сіл і сродкаў мы можам і павінны пасеўны плян выканаць.

І адначасна трэба ўжо прыступіць да практычнага правядзеньня сіласаваньня. Ня менш 10 проц. усяго пляну сіласаваньня кармоў трэба выканаць на працягу ліпеня месяца. Усе дзяка растучыя расьліны і пустазельле (крапіва, лебяда, чарот, аір, асокі усіх відаў), усё тое, што мы топчам пад нагамі і што перашкаджае росту каштоўных культур, павінна быць намі поўнасьцю выкарыстана, павінна быць намі ператворана ў каштоўны, сакавіты, смачны і спажыўны корм, усё гэта павінна быць пераапрацавана ў мяса, масла і малако.

**Чэрвень вырашае 10 проц. пляну сіласнай кампаніі, а ліпень—20 проц.** У ліпені ў добры корм для нашых стад павінны быць пераапрацаваны сьмяцьцёвыя расьліны ад прапоўкі гародаў і палявых культур, маладыя парасткі ліпы, клёну, ясеню, вязу, акацыі, рабіны, арэшніку. У гэты-ж тэрмін у траншэі і ямы павінны быць заложаны віка-аўсяная мешанка і пялюшка.

І так, 30 проц. пляну сіласаваньня кармоў мы павінны выканаць на працягу чэрвеня-ліпеня за кошт водкідаў ад гароднінства і палеводзтва, за кошт пустазельля... Гэтыя добрыя магчымасьці павінны быць шырока выкарыстаны. Ні адзін дзень, ні водная гадзіна не павінны быць упушчаны.

**А для гэтага неабходна ў самым тэрміновым парадку прывесьці ў парадак і прадэзынфэкцыраваць усе стары ямы і траншэі і па-баявому разгарнуць новае будаўніцтва.**

Пытаньне аб кадрах для сіласаваньня кармоў мае выключна важнае значэньне. Ад якасьці кадраў, якія праводзяць сіласаваньне, залежыць і якасьць сіласу. Дрэнна праведзенае сіласаваньне, сапсаваньне сіласу падрывае веру ў сілас, у гэты магутны рычаг рэканструкцыі жывёлагадоўлі. Неабходна перш за ўсё сабраць усе тыя кадры, якія мы рыхтавалі ў мінулым годзе, і пачаць разгорнутую масавую падрыхтоўку новых кадраў.

Робячы ўпор на сіласных ямах і траншэях бо ўрэшце ямы і траншэі выратаюць посьпех сіласнай кампаніі), мы адначасова з усёй сілай павінны **падкрэсьліць ганебнае становішча з выкананьнем нашай прамысловасьцю пляну будаўніцтва сіласных вежаў.** Плян будаўніцтва выкананы усяго толькі на 10 проц. Ганебнае адставаньне Бобруйскага дрэваапрацоўчага камбінату, заводу «Дрэваапрацоўшчык» у гэтай галіне павінна быць рашуча ліквідавана. Жывёлагадоўчыя саўгасы і калгасы ў сваёй барацьбе за бальшавіцкае выкананьне праблемы жывёлагадоўлі павінны атрымаць магутную падтрымку з боку нашай прамысловасьці ў выглядзе поўнага выкананьня пляну будаўніцтва сіласных вежаў.

Таксама рашуча павінны мы падкрэсьліць і адставаньне нашай прамысловасьці ў справе выкананьня пляну выпуску сіласарэзак. **Сіласарэзкі—адно з рашаючых зьвеньняў мэханізацыі працаёмістых работ па сіласаваньні кармоў.** Гэта павінны зразумець рабочыя Гомсельмаша і г. д. і напружыць усе сілы для ліквідацыі сваёй запазычанасьці сацыялістычнаму сэктару сельскае гаспадаркі.

Роля камсамолу ў барацьбе за сіласаваньне кармоў выключна вялікая. Камсамол павінен быць у першых радох змагароў за праграму сіласаваньня. Камсамол павінен стаць шэфам сіласнай кампаніі. Камсамол павінен стаць арганізатарам перамогі на сіласным фронце.

Сіласаваньне кармоў — адказная, баявая кампанія. **Сіласаваньне кармоў трэба разгарнуць як масавае мерапрыемства.** Упартай работай усёй пралетарскай грамадзкасьці, усіх калгаснікаў, шырокіх мас бяднацка-сераднацкага сялянства мы павінны забясьпечыць стварэньне ў БССР сіласных кармовых рэзэрваў у разьмеры ня менш 1 мільёна тон.

За мільён тон—у бой!

# Супроць фашысцкага ўраду беспрацоўя, голаду і нішчаты

## уздымаюцца працоўныя масы Нямеччыны

## Барыкадныя баі рабочых з паліцыяй у Кельне, Лейпцыгу і Бэрліне

БЭРЛІН, 14-VI. У Кельне ўчора адбылася дэманстрацыі галадаючых беспрацоўных. Дэманстрацыі прынялі асабліва бурны характар увечары. Дэманстранты разбурылі брук і наладзілі загароду, каб перасекчы дарогу паліцэйскім аўтамабілям.

Паліцыя са сталёвым шаблямі, узброеная карабінамі і ручнымі гранатамі абкружыла пасёлкі пралетарскія вуліцы, дзе арыштавала ўсё мужчынскае насельніцтва звыш 14-гадовага ўзросту. Арыштаваныя былі на грузавіках накіраваны ў цэнтр гораду, каб спыніць далейшыя дэманстрацыі.

Шматлюдныя дэманстрацыі беспрацоўных адбываліся ўчора таксама ў Лейпцыгу. У заходнім раёне гораду было разгромлена некалькі харчовых магазынаў. Калі дэманстранты наблізіліся да будынку фашысцкай арганізацыі быў выкліканы паліцэйскі атрад, узброены карабінамі. Паліцэйскія разагналі дэманстрацыю. У Бэрліне ўчора былі выпадкі разгрому магазынаў беспрацоўнымі заходняй і ўсходняй часткі гораду.

БЭРЛІН, 14-VI. Паліцэйскі атрад, у складзе некалькі сот чалавек і 30 агентаў крымінальнай паліцыі, учыніў налёт на памяшканьне «баявога саюзу барацьбы супроць фашызму».

Працяглы вобыск ня даў ніякіх вынікаў. Паліцыя арыштавала 12 чал., з іх старшыню антыфашысцкага саюзу Рурскай вобласьці па падазрэньні ў падрыхтоўцы «дзяржаўнай здрады».

Налёт на памяшканьне камітэту кампартыі адбываўся ўчора таксама ў Шлейсбургу. Арыштавана 13 актывістаў мясцовай арганізацыі кампартыі.

## Расстрэлы рабочых дэманстрацый працягваюцца

**БЭРЛІН 14. У ЗОЛІНГЕНЕ пазаўчора адбыўся шматлюдны мітынг пратэсту супроць надзвычайнага дэкрэту ўраду Брунінга. Паліцыя страляла ў рабочых. Ранена чэцьвера.**

**У КЕЛЬНЕ трэцяга дню працягваліся да глыбокай ночы дэманстрацыі рэвалюцыйных рабочых і сутычкі з паліцыяй. У шмат якіх раёнах паліцыя карысталася агнястрэльнай зброяй. Шмат рабочых ранена. Арыштавана каля 200 чалавек.**

**БЭРЛІН, 14. Тут ужо адбыўся рад мітынгаў межрабкому ў сувязі з сёнешнім днём міжнароднай салідарнасьці. Сёньня па ўсёй Нямеччыне адбудуцца масавыя рэвалюцыйныя дэманстрацыі і мітынгі.**

**МІТЫНГІ ЗАБАРОНЕНЫ.**

БЭРЛІН, 14. Начальнік Гамбурскай паліцыі сацыял-дэмакрат Шэмфэльдэр забараніў арганізуемы сёньня ў Гамбургу з прычыны міжнароднага дню салідарнасьці мітынг, на якім павінен быў выступіць тав. Тэльман.

НЯМЕЦКАЯ КАМПАРТЫЯ УЗМАЦНЯЕ СВАЮ РАБОТУ НА ВЁСЦЫ



Мітынг у вёсцы, наладжаны Бэрлінскай кампартыяй

## Праграма націску капіталу на жыцьцёвы ўзровень працоўных мас у Аўстрыі

ВЕНА, 12-VI. На нарадзе ўрадавых партый аўстрыйскі канцлер Эндэр паставіў ультыматыўнае патрабаваньне аб прыняцьці ў найкарацейшы тэрмін законапраэкту ўраду фінансавых мерапрыемстваў. Калі законапраэкт ня будзе прыняты, урад падасьць у адстаўку.

Эндэр абвясьціў урадавым партыям аб патрабаваньні чужаземнага капіталу неадкладна правесьці праграму рэжыму эканоміі, прычым адзначыў, што адхіленьне гэтай праграмы будзе мець сур'ёзныя вынікі і для ўсёй аўстрыйскай гаспадаркі. Газэта падкрэсьлівае, што на нарадзе ў часе спрэчак наконт заявы ўраду неаднакроць успаміналася аб пагрозе назначэньня зноў чужаземнага генэральнага камісара для кантролю над аўстрыйскімі фінансамі. Згодна афіцыёзнага паведамленьня ўраду, у Вену прыбылі прадстаўнікі італьянскай банкаўскай кампаніі. Яны прапанавалі супрацоўніцтва італьянскага ўраду ў справе аздараўленьня банку «Крэдытанштальт» і паведамілі, што ў Вену накіроўваюцца члены кантрольнай камісіі крэдытораў, спрод іх дырэктар ангельскага банку.

Газэта «Нэйестэ Нахрыхтэн» пратэстуе супроць фактычнага ўстанаўленьня чужаземнага фінансавага кантролю ў Аўстрыі, якое будзе ажыцьцёўлена нават яшчэ да таго, калі будзе выказана абяцаньне аб прадастаўленьні крэдытаў.

## Забастовачны фронт пэнсільваньскіх гарнякоў разрастаецца

НЬЮ-ЁРК, 12-VI. Забастоўка гарнякоў у штаце Пэнсыльванія бязупынна пашыраецца і набывае ўсё больш абвостраныя формы. Шэсьць тысяч бастуючых, іх жоны і дзеці штурмавалі турму ў Сэн-Клер, патрабуючы вызваленьня 11 рабочых, арыштаваных за ўдзел у пікетах.

Ня гледзячы на тое, што паліцыя кідала сьлёзагонныя бомбы і вывела такім спосабам 12 дэманстрантаў з строю, а таксама правяла рад арыштаў—ёй не ўдалося разгнаць дэманстрацыю.

Рэвалюцыйны прафсаюз гарнякоў канстатуе, што ў забастоўцы ўсходняй часткі штату Пэнсыльванія і ў суседнім раёне штату Агайо, зараз удзельнічаюць 22.000 гарнякоў. Міжрабпом арганізуе дапамогу бастуючым. Рэфармісцкі прафсаюз гарнякоў, які далучыўся да амэрыканскай фэдэрацыі працы, дарэмна спрабуе прарваць фронт бастуючых шляхам ускладненьня мясцовых згод аб устанаўленьні больш ніскай зарплаты. Лідэр рэфармісцкага прафсаюзу гарнякоў Луіс зьвярнуўся да прэзыдэнта Гувэрус з просьбай склікаць канфэрэнцыю прамыслоўцаў і рэфармісцкіх парфбюракратаў.

## Праграма „меншага зла", або апраўданьне здрады

БЭРЛІН, 10-VI. Для пазіцыі сацыял-дэмакратаў вельмі характарны перадавы прэзыдэнта, сацыял-дэмакрата Лебэ, зьмешчаны ў сёнешнім «Форвэртсе».

Лебэ, які напярэдадні сацыял-дэмакратычнага зьезду ў Лейпцыгу спрабаваў «левымі» манэўрамі маскаваць здрадніцкую палітыку сацыял-фашыстаў, зараз зусім адкрыта выступае ў ролі абаронцы вядомай тэорыі «меншага зла», гэткім, па думцы сацыял-фашыстаў, зьяўляецца ўрад Брунінга. Лебэ перасьцярагае сацыял-дэмакратычных рабочых ад ілюзіі, нібы адмаўленьне сацыял-дэмакратаў ад падтрыманьня ўраду Брунінга палегчыла-б цяжкі час, які перажываюць працоўныя масы Нямеччыны. Лебэ зазначае, што ў выпадку падзеньня ўраду Брунінга патрэбы шырокіх мас ня толькі ня зьменшацца, але будуць яшчэ больш паглыблены прыноўнага да ўлады новым урадам.

Гэты адтыкул Лебэ ліпні раз даводзіць, што адпаведна ўстаноўцы тактыкі партыйным зьездам у Лейпцыгу сацыял-дэмакратычная партыя, якая фармальна павінна вызначыць пазыцыю сацыял-дэмакратыі ў адносіне да ўрадавага дэкрэту, застанецца вернай апорай ураду Брунінга.

## Тав. Убарэвіч-камандуючы БВА

**Тав. УБАРЭВІЧ, Іеранім Пятровіч, нарадзіўся ў 1896 годзе ў сялянскай сям'і. Агульная адукацыя—рэальнае вучылішча. Па мабілізацыі быў прызваны на імпэрыялістычную вайну ў армію радавым. Па сканчэньні артылерыйскага вучылішча ў 1916 годзе быў праізведзены ў прапаршчыкі.**

**У Чырвоную армію добраахвотна ўступіў з моманту стварэньня Чырвонай гвардыі, пачаўшы службу з пасады камандзіра ўзводу і батарэі. У пэрыяд грамадзянскай вайны займаў рад вышэйшых камандных пасад: камбрыга Паўночнадзьвінскай, камдыву 16, камандарму 14, 9, 13, пам. камвойск Менскага і Тамбоўскага раёнаў, галоўкома Народнай рэвалюцыйнай арміі Далёка-ўсходняй рэспублікі, камандарма 5 і затым камандуючага войскамі Паўночна-Каўказкага і Маскоўскага вайсковых округ.**

**З лістапада 1929 году назначаецца начальнікам узбраеньняў РСЧА і з чэрвеня 1930 г. намесьнікам Народнага камісара па вайсковых і марскіх справах і старшыні Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету СССР.**

**З 11 чэрвеня г.г. назначаны на пасаду камандуючага войскамі Беларускай вайсковай акругі.**

**За баявыя ўчынкі ў грамадзянскай вайне ўзнагароджаны трыма ордэнамі «Чырвонага сьцягу» і пачэснай рэвалюцыйнай зброяй.**

**Член УсеКП(б) з 1917 г. Кандыдат у члены ЦК УсеКП(б). Член ЦВК СССР.**

## Тав. Тухачэўскі Міхаіл Мікалаевіч

**Намесьнік Наркам-ваенмора і намесьнік Старшыні Рэвваенсавету СССР**

# Ударнымі тэмпамі

## РЭАЛІЗАВАЦЬ І АФОРМІЦЬ ПАЗЫКУ 3-га РАШАЮЧАГА

### Шырока разгарнулася падпіска

(Ад нашага бабруйсскага кар.).

Працоўныя Бабруйску сустрэлі пастанову ўраду аб выпуску новай пазыкі трэцяга рашаючага году пяцігодкі з вялікім уздымам. Тыя патрабаваньні аб выпуску гэтай пазыкі, якія выносілі ў сваіх пастановах працоўныя Бабруйску раней, зараз ператвараюцца ў жыцьцё. Па асобных прадпрыемствах падпіска ўжо ахапіла больш паловы рабочых.

Як толькі закон ураду аб выпуску пазыкі быў атрыманы ў Бабруйску, па прадпрыемствах гораду адбыліся ня мітынгі, на якіх працоўныя, вітаючы выпуск пазыкі, заявілі аб неабходнасьці шпаркай рэалізацыі яе.

Гэтыя словы ператвараюцца ў справу. Гігант бабруйскай прамысловасьці Дрэваапрацоўчы Камбінат разгарнуў шырока падпіску на пазыку. Па беларэўным цэху гэтая падпіска дала ўжо больш 1500 рублёў, па пільні № 7 яна дала ўжо 3500 рублёў. Па пільні № 6 ахоплена падпіскаю палова рабочых. Падпіска дала на сёньняшні дзень каля 5 тысяч рублёў.

Рабочыя фанэрнага цэху абвясьцілі сябе ўдарникамі рэалізацыі пазыкі і тут-жа на сходзе абавязаліся ахапіць падпіскаю ўсіх рабочых ня менш, як на трохтыднёвы заработак.

Рабочыя гарбарні на сваім сходзе пастанавілі аддаць у пазыку дзяржаве ня менш месячнага свайго заработку. Гэтая пастанова ператвараецца ў жыцьцё,—разгортваецца падпіска.

Разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва паміж асобнымі прадпрыемствамі на лепшае разгортваньне працы па падпісцы на пазыку. Рабочыя фанэрнага цэху выклікалі на спаборніцтва рабочых іншых прадпрыемстваў; камсамольцы саюзу нарахаваньня выклікалі рабочых хлебазаводу, рабочыя сплаўной канторы правёўшы падпіску на суму 2500 урублёў, выклікалі асобныя вучасткі сплаву на разгортваньне працы па рэалізацыі пазыкі.

Разгортваецца спаборніцтва на лепшае правядзеньне падпіскі паміж асобнымі цэхамі прадпрыемстваў.

14 чэрвеня гарадзкі савет арганізуе ўрачыстае пасяджэньне з удзелам розных арганізацый, прысьвечанае выпуску пазыкі. На гэтым пасяджэньні працоўныя Бабруйску будуць аддаваць рапарты аб сваіх дасягненьнях у галіне разгортваньня падпіскі на пазыку будаўніцтва «513» і «1040».

**Д. Аланскі.**

### Падпісаліся на 100 проц.

(Менск).

Пастанова ўраду СССР аб выпуску пазыкі «3-га рашаючага году пяцігодкі» сустрэла гарачы водгук з боку студэнцтва Пэдфаку.

Шырока разгарнулася хваля падпіскі на новую пазыку на мэхзуцтвах 100 проц. падпіскі на 100 проц. стыпэндыі і заработку кожнага студэнта.

Выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу студэнцтва наргасу і саўбуду.

**Камсод.**

### На 120 проц.

На 12-га чэрвеня падпіскай на пазыку «3-ці рашаючы» ахоплена 34 проц. рабочых Менскага заводу «Камунар», што складае 37.000 руб.

Некаторыя рабочыя, як Пялітовіч, Гельман, Гарадзецкі (бляшаны цэх), Магер, Фрыд, Турэцкі, Мацкевіч (сьляцарны цэх) падпісаліся на 120 проц. месячнага заработку.

Падпіска працягваецца і ў бліжэйшыя дні будзе скончана.

**М.**

### Шырока разгарнулі кампанію

Сярод студэнтаў Камвузу шырока разгорнута кампанія сацспаборніцтва па падпісцы на пазыку «3-ці рашаючы год пяцігодкі». Савецкае і партыйнае аддзяленьні падпісаліся ўсе калектыўна на 100 проц. месячнай стыпэндыі, што дало каля 5.000 руб. і выклікалі савецкае і партыйнае аддзяленьні 1-га курсу пасьледваць іх прыкладу.

Цалкам падпісаліся курсанты КСМ-курсаў на 100-проц. месячнай стыпэндыі і выклікалі курсы актыву.

**Савецкі.**



### Падпісваемся на пазыку

(Менск).

Заслухаўшы даклад аб выпуску пазыкі «3-ці рашаючы год пяцігодкі», аўдыторны сход вучняў і настаўнікаў 2-й ФЗС ухваляе мерапрыемства ўраду і партыі аб выпуску пазыкі. «3-ці рашаючы». Падпісваемся на гэтую пазыку ў суме пяці з палов. тысяч рублёў і выклікаем садружныя школы: 30 яўрэйскую і 5-ю расійскую гор. Менску, а таксама ўсе 2-я школы СССР.

## Безадкладна выправіць недахопы

### Усім загадчыкам райфа і гарфа

Весткі пра ход падліку аб'ектаў абкладаньня сьведчаць аб тым, што гэтая важнейшая гаспадарча-палітычная кампанія праходзіць нездавальняюча. У шэрагу раёнаў ня толькі не выяўляюцца ўкрытыя аб'екты, але нават ма ецца недападлік супроць леташняга, пасеваў, жывёлы і заработкаў, **што не адпавядае сапраўднаму становішчу і росту сельскае гаспадаркі.** Дрэнна выяўляюцца каньюнктурныя даходы, разам з гэтым у некаторых мясцох у гэтай справе назіраецца тэндэнцыя да шкодных перагібаў. Зусім яшчэ слаба разгорнута работа па выяўленьні кулакоў. Асабліва дрэнна праходзіць падлік па **Веткаўскім раёне**, па якім маецца памяншэньне: нахаці на—3,1 проц., пасеву—6,3 проц., лугоў, 2,9 проц., кароў—9,4 проц. і коняй—9,1 проц.; па **Юравіцкім** раёне памяншаюцца лугі на 5,8 проц., кароды—7,9 проц., коні—13,9 проц., і зусім недастакова выяўляюцца неземляробчыя заработкі; па **Лагойскім** раёне—памяншаецца пасеў на 0,6 проц., каровы—16,3 проц., коні—7,8 проц. і зусім недастаткова выяўляюцца неземляробчыя заработкі; па **Чачэвіцкім** раёне — памяншаюцца каровы на 15,5 проц., і коні—21 проц., і **Бярэзінскім раёне** — памяншаюцца каровы на 10,5 проц. і коні на 36,5 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што фінансавы апарат гэтых раёнаў замест сапраўднага кіраўніцтва работай сельскіх падатковых камісій і праверкі іх работы, дапускае на справе праваапартуністычны самацёк.

Лічачы становішча падліку аб'ектаў напражаючым, катэгарычна прапаную пад пэрсанальную адказнасьць загадчыкаў Райфа і Гарфа безадкладна прыняць самыя рашучыя меры да выпраўленьня ўсіх недахопаў у кампаніі на аснове тэлеграфных паказаньняў НКФ за 7 чэрвеня ў прыватнасьці: арганізаваць фактычную праверку аб'ектаў на мясцох, адмяніць і паўторна правесьці падлік па паселішчах, дзе ён даў дрэнныя вынікі, **актывізаваць працу з калгасьнікамі і беднатой, даючы жорсткі адпор кулацкай агітацыі за ўтайку аб'ектаў.**

Папераджаю, што аб ступені выкананьня гэтай дырэктывы буду мяркаваць па чарговай зводцы на 20 чэрвеня.

Загадчыкам **Веткаўскага, Юравіцкага, Лагойскага, Чачэвіцкага і Бярэзінскага** раёнаў у трохдзённы тэрмін прадставіць мне тлумачэньні аб прычынах дрэннага падліку аб'ектаў па сельгаспадатку.

Народны Камісар Фінансаў БССР
**Хацкевіч.**

# Шырэй падрыхтоўку да ўсебеларускага зьезду рабселькораў

## СТАРШЫНЯМ ГАР. І РАЙ КК РСІ

Шэраг Гар. і Рай КК-РСІ да гэтага часу разгарнулі слабую работу па падрыхтоўцы да Ўсебеларускага Зьезду рабселькораў.

Улічваючы вялізарную палітычную важнасьць падрыхтоўчай работы да зьезду рабселькораў, які павінен зьявіцца пераломным у замацаваньні і пашырэньні рабселькораўскіх кадраў і мабілізацыі рабочых і працоўных мас на выкананьне задач 3-га рашаючага году пяцігодкі,—ЦКК КП(б)Б—НК РСІ прапануе Гор. і Рай КК-РСІ зараз-жа разгарнуць сапраўдныя тэмпы ў рабоце, узмацніўшы сувязь з рэдакцыямі газэт, рабселькорамі, накіраваўшы дзейнасьць і актыўнасьць грамадзкасьці ў наступным напрамку:

1. Забясьпечыць шырокае абгаварэньне пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове работы з рабселькорамі, дабіваючыся няўхільнага ажыцьцяўленьня лёзунгу «Кожны рабселькор—ударнік, кожны ўдарнік—рабселькор», зрабіўшы гэты вядучы лёзунг здабыткам кожнага рабочага і калгасьніка.

2. Уся падрыхтоўка да рабселькораўскага зьезду павінна быць глыбока прасякнута гаспадарча-палітычнымі задачамі сёнешняга дня, мабілізуючы ўсе сілы рабочых і працоўных мас на неабходную ліквідацыю прарываў прамфінпляну, на пашырэньне і замацаваньне калектывізацыі с.-г., на поўнае выкананьне і перавыкананьне ўсіх плянаў сяўбы, асабліва па тэхнічных культурах, на аўладаньне тэхнікай і разгортваньне высокіх тэмпаў ва ўсёй рабоце па сацыялістычным будаўніцтве.

3. Правесьці да 25 чэрвеня сіламі рабселькораўскіх брыгад і актыву КК-РСІ выбарчую праверку рэагаваньня на крытыку ў друку і прапановы рабочых і калгасных мас над кутом ажыцьцяўленьня пастановы Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б па выніках Усебеларускага рабселькораўскага рэйду.

Гэтай работай патрэбна дабіцца ўзмацненьня рэагаваньня і дзейнасьці крытыкі, уздымаючы ролю самой КК-РСІ у справе хуткага рэагаваньня.

4. Правесьці сумесна з раённымі газэтамі і інш. кіруючымі орг. раёну масавыя сходы—нарады рабселькораў, рабочых, калгасных, батрацка-бяднацкіх і сераднацкіх мас па абгаварэньні праектаў тэзісаў да Зьезду Рабселькораў, дабіваючыся сустрэчных канкрэтных прапаноў і дадаткаў да тэзісаў. Гэтыя масавыя сходы неабходна выкарыстаць дзеля арганізацыі далейшага прыліву ў калгасы, арганізацыі ўдарных рабселькораўскіх брыгад і інш. мерапрыемстваў.

5. Падагуліць увесь маючыйся вопыт сумеснай работы КК-РСІ з друкам і рабселькорамі, шырока асьвятляючы гэты вопыт на астаронках нізавога раённага і цэнтральнага друку, дабіцца замацаваньня і пашырэньня рабселькораўскага актыву вакол КК-РСІ, уцягваючы яго ў практычную работу.

ЦКК-НК РСІ даручае ўсім Гор. і Рай КК-РСІ неадкладна пераключыцца на гэтае важнейшае мерапрыемства, у 3-х дзённы тэрмін праверыць раённыя і нізавыя зьвеньні па падрыхтоўцы да зьезду, забясьпечыўшы мабілізацыю ўвагі ўсёй парт. арганізацыі і ўсіх працоўных на ажыцьцяўленьне пастановы партыі па разгортваньні сьмелай пралетарскай самакрытыкі, як асноўнага мэтаду ва ўсёй рабоце, на падвышэньне ролі друку і рабселькораўскай арміі ў барацьбе за генэральную лінію партыі.

Лічыць неабходным на чарговым пасяджэньні Прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б заслухаць тры КК-РСІ аб іх падрыхтоўцы да зьезду рабселькораў.

Даручыць усім КК-РСІ, пад асабістую адказнасьць старшыні КК-РСІ, да 31-VI—31 г. усе матар'ялы і вынікі аб праробленай рабоце даслаць у ЦКК і рэдакцыю «Рабселькора».

**Старшыня ЦКК КП(б)Б—нарком РСІ БССР**
**КАЛНІН.**

14 чэрвеня, 1931г.

## Ад арганізацыі

### па скліканьні ўсебеларускага зьезду рабселькораў

Усебеларускі зьезд рабселькораў ад крывяецца ў г. Менску 30 чэрвеня г. г., а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканні Вялікай залі Дому Камуністычнай Асьветы імя Карла Маркса (вул. Карла Маркса, д. № 30 (47).

**ПАРАДАК ДНЯ ЗЬЕЗДУ:**

1. Задачы друку ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі—дакладчык **т. К. В. ГЕЙ.**

2. Задачы рабселькораўскага руху, парткіраўніцтва ім і ўдарництва ў друку — дакладчыкі—Будзінскі і Курцік.

Апрача гэтага на зьезьдзе будуць працаваць наступныя сэкцыі па асобных галінах прамысловасьці і сельскай гаспадаркі: а) мэталяапрацоўчая прамысловасьці; б) торфэнэргетыка; в) чыгунчана-воднага транспарту; г) дрэваапрацоўчай прамысловасьці; д) па перабудове каапэрацыі; е) жывёласьвінагадоўчая сэкцыя; ж) ільнаводчых і тэхнічных культур; з) сэкцыя МТС; і) гарбарна-абутковай прамысловасьці; к) сэкцыя тэкстыльна-швэйнай прамысловасьці.

Работа ў сэкцыях будзе пабудавана наступным чынам:

1. Даклад рэдакцыі газэты, якая вядзе сэкцыю.

2. Судаклад гаспадарніка (заводу, фабрыкі, саўгасу, калгасу, аб'яднаньня).

Вузлавыя задачы рабселькораў і нізавога друку.

3. Судаклад аднэй з шматтыражных фабрычна-заводзкай, саўгасна-калгаснай газэты—вопыт апэрацыйнамасавай работы шматтыражкі і рабселькораў у барацьбе за прамфінпляны, за калектывізацыю і г. д.

Спрэчкі па дакладах і абгаварэньне тэзісаў (абавязкова па пунктах).

У часе зьезду будуць паладжаны экскурсіі на фабрыкі і заводы і г. д., аб'яднаньня пасяджэньні асобных зьвеньняў паміж сабой сетак прамысловасьці і сельскай гаспадаркі і інш.

Уся работа зьезду будзе праходзіць паводле строга разьлічанага каляндарнага пляну, які будзе складацца пры адкрыцьці зьезду.

Дэлегаты на зьезд прыяжджаюць у Менск па атрыманьні асабістых паведамленьняў аргкамісіі, якія прад'яўляюцца пры атрыманьні мандатаў.

Дэлегаты звыш нормаў і без паведамленьня прымацца ня будуць.

Выдача мандатаў будзе праводзіцца часовай мандатнай камісіяй 29 і 30 чэрвеня г. г. з 9 гадз. раніцы ў памяшканьні рэдакцыі газэты «Зьвязда» (Савецкая вул., дом № 63, 2-гі паверх, пакой № 4), куды павінны зьяўляцца ўсе прыяжджаючыя дэлегаты.

**Адк. сакратар аргкамісіі па скліканьні Ўсебеларускага зьезду рабселькораў ЗЭЛЬЦАР.**

## СЬПІС

### таварышоў, вылучаных у дапамогу партыйным і прафарганізацыям для прапрацоўкі праекту тэзісаў - матар'ялаў для усебеларускага зьезду рабселькораў

**I. ЧЫГУНКА.**

1. Служба Цягі т. т. Ярыгін і Празор
2. Служба Эксплёатацыі—т. т. Верстак і Каплан.
3. Служба Шляху—т.т. Кішчынскі і Гохфельд.
4. Транспартнікі—т.т. Углянец і Хвасьцюк.

**II. МЭТАЛЯАПРАЎЧАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ.**

5. Завод імя «Варашылава»—т.т. Вербa і Зубаў.
6. Завод «Камунар»—т. т.Міньковy і Рубінштэйн.
7. Завод «Ударнік» т. т. Красоўскі і Лесковіч.

**III. ДРЭВААПРАЦОЎЧАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ.**

8. Завод «Д. А.»—т. т. Маяў і Гольдберг.

**IV. СКУРНА-АБУТКОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ.**

9. Завод «Бальшавік»—т. т. Зюськоў і Ізакаў.
10. Абутковая фабрыка—тт. Белюсь і Шэрман.
11. Шчотачная фабрыка—тт. Юргелевіч і Додзін.

**V. ШВЭЙНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ.**

12. Фабрыка «Кастрычнік»—т.т. Савіцкі і Савіч.
13. Скарняжная—т. Самахвалаў.
14. Фабрыка імя Крупскай—т.т. Браверман і Касая.
15. Фабрыка 8-е Сакавіка—т.т. Гаеўскі і Путырская.

**VI. ПРЫГАРОДНЫЯ ГАСПАДАРКІ.**

16. Саўгас Лошыца—т.т. Якоўскі і Чарэбін.
17. Саўгас імя Лекерта—т.т. Каршакевіч і Дворкін.
18. Саўгас Вішнёўка—т.т. Меркулаў Серкульскі.
19. Саўгас «1-е Мая»—т.т. Сергавец і Вальчэ.
20. Каапэрацыйныя арганізацыі—т. т. Гузман і Пячонка.
21. Шклозавод—т.т. Фінтушаль.
22. Эльвод—т.т. Нахышц і Кажаброцкі.
23. Куспрамсаюз—т.т. Ардашнікаў, Кошэлеў, Самонаў і Лічко.

Усе астатнія т.т.—гаспадарнікі, спэцыялісты і прафпрацаўнікі прапрацоўваюць тэзісы ў сваіх сыстэмах (на заводах, фабрыках, установах) па сэкцыях галіны прамысловасьці, альбо сельскай гаспадаркі, у якіх ёй мае спэцыяльнасьць (лён, жывёлагадоўля і г. д.) і свае дадаткі, папраўкі і матар'ялы накіроўвае ў Оргкамісію.

Вылучаныя т.т. праекты-тэзісы могуць атрымаць 14-га чэрвеня з 9 гадз. раніцы да 6 гадз. увечары, памяшканьне ЦК КП(б)Б, пакой № 11.

Просьба да ўсіх партыйных і прафэсіянальных арганізацый аказаць садзейнічаньне вылучаным т.т. і прыняць непасрэдны ўдзел у распрацоўцы праекту тэзісаў да зьезду.

Загадчык культпропам Менгаркому КП(б)Б
**КУЛІНЕНКА.**

Сакратар камісіі па скліканьні Ўсебеларускага зьезду рабселькораў
**ЗЭЛЬЦАР.**

## Кансультацыя рабселькорам-мастакам і рэд. фабр.-заводзкіх газэт

**Усім рабселькорам-мастаком і рэд. фабр.-зав

У барацабу за лён

# Не паслабляючы тэмпаў сяўбы

## рыхтавацца да ўборкі лёну і канапель

**На 10 чэрвеня недасеяна 27 проц. лёну і канапель. Прарыў неабходна ліквідаваць**

## Узброіцца да сустрэчы ільнаўборачнай кампаніі

Беларусь у гэтым годзе трымае сур'ёзнейшы экзамін. Яна павінна будзе ўбраць і ператварыць у тавар ураджай лёну з плошчы зямлі каля ¼ мільёна гектараў. У адных МТС засяецца каля 40 тыс. гект. лёну.

Сарочка адразу ў полі ня вырастае. Лён зьяўляецца надзвычай працаёмкай культурай. Ператварэньне лёну ў высокагатунковы тавар, як для экспарту, так і для ўнутрысаюзнай прамысловасьці, зьвязана з працэсамі, якія павінны быць правільна пастаўлены і дакладна разьлічаны як у разрэзе часу, так і ў разрэзе вытворчых магчымасьцяй, а ўсё гэта разам узятае ўпіраецца ў пытаньне аб падрыхтоўцы да ільнаўборачнай кампаніі.

Ня гледзячы на тое, што Беларусь даўно сее лён, ільнаводаў у нас, аднак надзвычай мала. Акрамя таго, гэта культура патрабуе спэцыяльных паглыбленых ведаў, а між тым нават і запальная станцыя не папулярызуе свае досьледы.

Таму ў выніку незахаваньня спэцыяльных правіл па падрыхтоўцы і выбабе глебы для пасеву лёну мы ў першую чаргу (дзён праз 12-15 пасьля пасеву) спаткаемся з усходамі вялікай колькасьці пустазельля. Гэтыя травы, калі іх сваячасова ня вырываць з карэньнямі, вырастаюць вышэй чалавечага росту, губяць і зводзяць да нуля ўвесь пасеў лёну. У мінулым годзе гэта здарылася са значнай часткай лёну ў саўгасе «Адамёнкі».

Брашура ільнавода т. Тарасава, дзе падрабязна растлумачваецца пытаньне аб пустазельлі, ужо каля паўгоду марынуецца ў Белдзяржвыдавецтве і ня выходзіць з друку.

Другой важнай справай у ільнаўборачнай кампаніі зьяўляецца вызначэнь не ступені сьпеласьці лёну, падыходзяй чай да цераблеьня.

Справа ў тым, што на гэты конт існуюць дзьве думкі: адна за тое, што лён трэба церабіць у той момант, калі галоўкі яго яшчэ ня зусім пасьпелі, г. зн., калі яны яшчэ маюць зялёнабурую афарбоўку, а насеньне атрымала толькі сваю форму; другая—за сова забясьпечаны ў дастатков

# Пара прыступіць да сіласаваньня

**Зацяжка будаўніцтва сіласных установак пагражае зрывам пляну сіласаваньня. Лесбел яшчэ не павярнуўся тварам да сваячасовага выкананьня заказаў**

**Біцца за мільён тон сіласу! Асаку, аер, чарот, пустазельле—у сіласную ўстаноўку**

## Зараз-жа пачаць сіласаваньне кармоў

Праграма сіласаваньня для БССР на 1931 год, вызначаная ў 1 млн. тон, павінна зьявіцца сродкам для стварэньня моцнай кармовай базы. З гэтай колькасьці 878.000 тон намечана засіласаваць у ямах і траншэях, а рэшта ў сіласных вежах.

Вопыт мінулага году паказаў, што ўсякая адцяжка тэрмінаў будаўніцтва сіласных установак пагражае зрывам выкананьня пляну сіласаваньня. Ня гледзячы на тое, што аб падрыхтоўцы да сіласнай кампаніі пачалі гаварыць ледзь не са студзеня г. г.,—аж да апошняга часу мы знаходзімся ўсе ў стадыі «падрыхтоўкі». Пара ўжо прыступіць да сіласаваньня кармоў!

Прамысловасьць БССР у асобе Лесбела проста зрывае плян выпуску клёпкі для сіласных вежаў. Да 1-га ліпеня трэба было поўнасьцю закончыць адгрузку 274 сіласных вежаў, вызначаных для БССР, але на справе на 12-га чэрвеня адгружана ўсяго 10,1 проц. пляну. Бязумоўна, калі і надалей прамысловасьць будзе працаваць з такімі-ж тэмпамі, плян будаўніцтва сіласных вежаў будзе сарваны.

Ня гледзячы на тое, што эсноўная маса кармоў будзе сіласавацца ў ямах і траншэях, да будаўніцтва іх амаль нідзе не прыступаюць. Саўгасы і калгасы зусім не зварочаюць увагі на гэтую справу. Між тым трэба ўжо прыступіць да сіласаваньня кармоў. У нас ёсьць неабмежаваныя запасы зялёнай масы: асакі, аеру, чароту, пустазельля і г. д. Трэба дабіцца, каб зараз-жа пачаць сіласаваньне кармоў у тых сіласных установоўках, якія былі пабудаваны ў мінулым годзе. Адначасна з гэтым трэба ўдарна праводзіць будаўніцтва новых ям і траншэй, каб закончыць іх да пачатку ўборачнай кампаніі.

Недапушчальна марудна разгортваецца сяўба сіласных культур. На 10-га чэрвеня плян сяўбы на сіласных культурах выканан усяго на 19,2 проц., што зьяўляецца зусім незадавальняючым. Ня гледзячы на абмежаваную колькасьць насеньня сіласных культур ёсьць пагроза, што ў шмат якіх месцах і гэтая колькасьць застанецца невыкарыстанай. Трэба дабіцца, каб плян засеву сіласных культур быў поўнасьцю выкананы.

Падрыхтоўка патрэбных кадраў майстроў па сіласаваньні павінна адыграць вялікую ролю ў правядзеньні сіласнай кампаніі. У раёнах павінны праводзіцца зараз курсы па сіласаваньні. Паводле вестак з месц, некаторыя раёны адносяцца нядбайна да гэтага мерапрыемства. У Бабруйску, напрыклад, нават ня ведаюць яшчэ калі такія курсы будуць адкрыты. Курсы па падрыхтоўцы майстроў павінны зараз-жа быць адкрыты ва ўсіх вызначаных пунктах.

Немалаважным пытаньнем у справе будаўніцтва ўстановак, асабліва, вежаў, зьяўляецца бесьперабойнае забесьпячэньне іх цьвікамі. Зараз у нас адчуваецца вялікі недахоп у цьвіках. Нашы арганізацыі па забесьпячэньні павінны зьвярнуць сур'ёзную ўвагу на сваячасовы і дастатковы завоз цьвікоў.

І, нарэшце, вельмі важным пытаньнем зьяўляецца правільны вучот і належнае кіраўніцтва сіласным будаўніцтвам і ходам сіласаваньня. Ня гледзячы на тое, што сіласная кампанія зьяўляецца мерапрыемствам першачарговай важнасьці, нельга сказаць, што яна праводзіцца арганізавана і чотка. Цэнтральныя ўстановы нічога ня ведаюць, што робіцца на мясцох. Наркамзем яшчэ ня стаў сапраўдным штабам кіраўніцтва па правядзеньні сіласнай кампаніі.

Трэба рашуча пакончыць з самацёкам у гэтай справе. Вакол гэтай палітычна-гаспадарчай кампаніі павінны быць мабілізаваны шырокія масы працоўных. Толькі пры такіх умовах, пры арганізацыі шырокага кантролю мы даб'ёмся выкананьня і перавыкананьня пляну па сіласаваньні кармоў.

**К. І.**

Раздача сіласнага карму.

## Тэмпы будаўніцтва сіласных вежаў недапушчальна марудныя

Прамысловасьць БССР павінна выпусьціць да 1-га ліпеня 388 сіласных вежаў, з якіх для Сацецкай Беларусі—247. Завод «Дрэваапрацоўшчык» павінен выпусьціць 100 сіласных вежаў сыстэмы «КІНГА», Бабруйскі камбінат—250—«Віскансінскага» і 38—«КІНГА».

Ня гледзячы на тое, што да апошняга тэрміну выпуску вежаў засталіся лічаныя дні, прамысловасьць недапушчальна марудна праводзіць адгрузку вежаў. На 12 чэрвеня завод «Дрэваапрацоўшчык» адгрузіў 10, Бабруйскі камбінат—15 вежаў.

Ці-ж гэта не ганебныя лічбы? Заводы павінны ўзмоцніць тэмпы вырабу сіласных вежаў і іх адгрузку.

Таксам дрэнна стаіць справа з завозам мэталёвых частак да вежаў. Заказы на мэталёвыя часткі да сіласных вежаў раскіданы па 13 заводах СССР, галоўным чынам, па маскоўскіх. Паступленьне мэталёвых частак пачалося, але яны прыбываюць у абмежаванай колькасьці і некамплектныя.

Недапушчальнымі зьяўляюцца адно сны некаторых райкаапсаюзаў да выкарыстаньня завезенага цэманту. Увесь цэмант, які паступае цяпер з заводаў, выключна перадаецца на забесьпячэньне будаўніцтва сіласных вежаў, але некаторыя райкаапсаюзы (Менскі і Сьвіслацкі) адмаўляюцца выканаць раз нарадку ў бліжэйшыя да іх раёны і гэтым зрываюць будаўніцтва сіласных вежаў.

Трэба спыніць месьнідзкія настроі. Райкаапсаюзы павінны не затрымліваць цэмант і пакіроўваць яго ў вызначаныя адрасы.

Завод «Дрэваапрацоўшчык» і Бабруйскі камбінат павінны пераключыцца на ўдарныя тэмпы, каб да 1-га ліпеня поўнасьцю закончыць выпуск клёпкі для вежаў і поўнасьцю закончыць адгрузку яе.

Белсельснаб і Усесаюзнае Акцыянэрнае Т-ва «Сельхозснабжение» павінны са свайго боку паскорыць адгрузку мэталёвых частак да сіласных вежаў.

Райкаапсаюзы абавязаны выканаць разнарадку Белсельснабу для пераадпраўкі цэманту ў другія р-ны, якія мяжуюць з імі, каб забясьпечыць бесьперабойнае будаўніцтва падмуркаў для вежаў.

**Фрыдман.**

## Чаму ня будуюць вежу?

Калгас «Вольная Беларусь», Казловіцкага сельсавету, Слуцкага раёну, мае жывёлагадоўчы напрамак. Калгас мае 104 галавы буйнай рагатай жывёлы. У мінулым годзе была засіласавана значная колькасьць зялёных кармоў.

Аднак, ня гледзячы на тое, што дзяючы сіласу калгасу ўдалося захаваць у цэласьці ўвесь статак, зараз ні чога ня робіцца, каб належна падрыхтавацца да сіласнай кампаніі. Калгасу трэба пабудаваць сіласную вежу на 300 тон, але справа знаходзіцца на мертвым пункце.

**Мазо.**

## Папярэдзіць зрыў будаўніцтва сіласных установак

**Бабруйск.** (Наш. кар.). Ход сяўбы траў і сіласных культур па раёне сьведчыць аб вялізарным прарыве ў гэтай галіне. Сярэдэлі замест вызначаных па пляну 406 га, засеяна толькі 82 га. Яшчэ горш справа з канюшынай: трэба засеяць 1222 га, а фактычна засеяна каля 400 га. Такое-ж становішча з засевам і лугавых траў: па пляну вызначана 200 га, а засеяна толькі 16 га.

Надта марудна праходзіць сяўба сіласных культур. Па калгасах замест вызначаных 344 га, засеяна толькі 40 га. Поўнасьцю выканалі плян сяўбы па сіласных культурах наступныя калгасы: Селішча, імя Сталіна, «Чырвоная Беларусь», «Муравей», камуна імя Вароўскага, калгас «Чырвоная Бярэзіна», «Свабода», «Наер-Лэбн» і яшчэ некаторыя, астатнія калгасы ці толькі яшчэ зьбіраюцца, ці зусім ня думаюць сеяць.

Таксама нічога ня робіцца па падрыхтоўцы да сіласаваньня кармоў. Агульны плян па сіласаваньні выконан у разьмеры 8.000 тон зялёнай масы, прычым 20 проц. гэтай колькасьці павінна быць засіласавана да 15 ліпеня. Неабходна пабудаваць 61 яму, 52 траншэі, 1 мураваную і 2 стандартных сіласных вежы. Да будаўніцтва сіласных ям і траншэй калгасы яшчэ ня прыступілі. Райкалгассаюз нават ня ведае адкуль ён павінен атрымаць будаўнічыя матар'ялы на будаўніцтва вежаў.

У раёне намечана правесьці курсы па сіласаваньні. Курсы пара адкрываць, але аб гэтым ніхто не клапоціцца. Такім чынам да пачатку раньняга сіласаваньня ня будуць падрыхтаваны патрэбныя кадры. Усе гэтыя факты сыгналізуюць аб тым, што ёсьць небясьпека прарыву ў справе стварэньня моцнай кармовай базы на Бабруйшчыне. Гэты прарыў павінен быць папярэджан. Папярэдзіць яго можна толькі разгортваньнем ударнай работы па выкананьні пляну засеву траў і сіласных культур і выкананьні пляну будаўніцтва сіласных установак.

**Д. Аланскі.**

## Выкінулі на вецер насеньне

У прыгарадным саўгасе імя Лекерта было засеяна 5 га кукурузы пад сілас. Праз два дні пасьля гэтага кіраўнік саўгасу Сіповіч, узяўшыся выконваць абавязкі агранома, загадаў на гэтым-жа самым месцы другі раз пасеяць кукурузу. Калі-ж кукурузу пачалі абганяць, дык усходы, якія ўзышлі ў барознах, прышлося засыпаць, у выніку чаго да 50 проц. усходаў кукурузы зьнішчана, удвая патрачана насеньня.

Рабочая грамадзкасьць саўгасу абурана такімі адносінамі да работы, калі марна патрацілі рабочую і цягавую сілу і выкінулі на вецер насеньне кукурузы.

**Вока.**

# НАДЫХОДЗЯЦЬ РАШАЮЧЫЯ ДНІ БАРАЦЬБЫ ЗА УРАДЖАЙ

**Рамонтныя майстэрні—на поўны ход. Пуцёўку ўборачнай—канкрэтны рабочы плян—брыгадзе, кожнаму рабочаму, кожнаму калгасьніку**

## Насустрач новаму ўраджаю

Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі зьяўляецца аднэй з важнейшых гасподарча-палітычных кампаній. Ад поўнага і пасьпяховага правядзеньня ўборачнай кампаніі будзе залежаць і пасьпяховае сканчэньне самой уборкі. Кожны РВК і райкалгассаюз павінны ведаць, якая вялікая адказнасьць ускладзена на іх у справе падрыхтоўкі да ўборкі.

Нажаль, на сёньняшні дзень падрыхтоўцы да ўборкі яшчэ не нададзена належнай увагі. Большасьць раёнаў яшчэ не пачалі падрыхтоўкі. С.-г. машыны не адрамантаваны, ня прывезены ў парадак дробны ўборачны інвэнтар. Паводле вестак з Калгасцэнтру, да ўборачнай кампаніі рыхтуюцца толькі некалькі раёнаў. Большасьць-жа раёнаў работы па падрыхтоўцы да ўборачнай яшчэ не разгарнулі.

Любаньскі раён на 10-га чэрвеня свой плян па рамонце с.-г. машын выканаў на 100 проц., Сураскі—на 97 проц., Пухавіцкі—на 80 проц., Горацкі—на 50 проц. і Старобінскі—на 30 проц. Іншыя-ж раёны яшчэ не пачыналі рамонту, або ня далі аб сябе ніякіх вестак.

Падрыхтоўку да ўборкі трэба паставіць у цэнтр усёй работы. Трэба зараз-жа на-хаду ліквідаваць прарывы і па-ўдарнаму рыхтавацца да сустрэчы новага ўраджаю.

**К.**

## Махіраўцы ня рыхтуюцца да ўборкі. Машыны не рамантуюцца

У Міхіраўскім сельсавеце, Полацкага раёну, ніякай падрыхтоўчай работы да ўборачнай кампаніі не вядзецца. Весняная сяўба яравых у калгасах і ў аднаасобных бядняцка-сераднякіх гасподарках праходзіць марудна. У сельсавеце з 7 калгасаў толькі 2 перайшлі на зьдзельшчыну, а ў астатніх калгасах зьдзельшчына засталася на паперы. У нова арганізаваных калгасах—«Баявік», «Зьняда», «Чырвоны Артылерыст» ёсьць 3 жнеяркі, 3 грабель і 2 касілкі, якія на сёньняшні дзень яшчэ стаяць папсаванымі. Ні праўленьні калгасаў, ні райкалгассаюз не клапоцяцца, каб забясьпечыць новыя калгасы ўборачнымі машынамі і не рамантуюць машын у старых калгасах. Некаторыя старшыні калгасаў разважаюць: «з уборачнай кампаніяй яшчэ пасьпеем. Не хапае машын—мы і рукамі ўсё зробім». Пастанова Наркамзему СССР аб правядзеньні ўборачнай кампаніі сярод калгасьнікаў не папулярызуецца. Сельсавет таксама стаіць у баку ад падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі. Старшыня сельсавету тав. Паўлаў гаворыць: «Падрыхтоўка да ўборкі—гэта справа не сельсавету. Гэтым пытаньнем павінны займацца самі калгасы.». Партыйна-камсамольская арганізацыі таксама нічога ў гэтай галіне ня робяць. Неабходна ў самы хутчэйшы час пачаць падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі.

**Мікола Яроменка.**

## Дукорскі сельсавет па-ўдарнаму рыхтуецца да ўборкі

У Дукорскім сельсавеце, Сьмілавіцкага раёну, па-ўдарнаму пачалі рыхтавацца да ўборачнай кампаніі. Па ўсіх калгасах праводзяцца сходы калгасьнікаў, стварэюцца ўдарныя брыгады, праводзіцца рамонт уборачнага інвэнтара. Калгасы імя ЦВК БССР, «16 партызан», «Чырвоны Партызан», «Праца», першымі пачалі падрыхтоўку. У калгасах будуць выдадзены насьценгазэты, прысьвечаныя ўборцы. Камсамольская ячэйка да кожнага калгасу прымацавала свайго камсамольца, які павінен сачыць за ходам падрыхтоўкі, а таксама дапамагаць у яе правядзеньні. Партыйная ячэйка першая мабілізавала свае сілы на гэтую кампанію.

**Л. Ц.**

## Максымальна скары стаць папар

Вялікую колькасьць ураджаю мы трацім з-за таго, што позна ўзораем папар. У той час, калі ставіцца пытань не аб падвышэньні ўраджайнасьці, мерапрыемства раньняга ўзорваньня папару або захаваньне яго чыстым, зьяўляецца адным з галоўнейшых пытаньняў, якое мы можам у нашых умовах з посьпехам ажыцьцяўляць. Але трэба сказаць, што да гэтага часу яно лічыцца другараднай справай.

Звычайна пасьля сканчэньня весняной пасеўкампаніі ідзе падрыхтоўка да ўборачнай, а потым ужо і падрыхтоўка да асеньняй сяўбы. У сапраўднасьці падрыхтоўка да асеньняй сяўбы павінна пачынацца ад самай вясны, бо калі папар будзе заняты раньнімі культурамі (віка - аўсом, а ў нас так і павінна рабіцца—за кошт папару пашыраць яравы клін), дык трэба хутчэй даваць месца для азімых культур.

Але-ж, на вялікі жаль, папар не засяецца раньнімі яравымі культурамі і, замест таго, каб ён быў узараны ў маі, ляжыць аблогам аж да ліпеня і нават жніўня месяца. На папары пасуць жывёлу, якая ўбівае яго так, што ён рабіцца цьвёрдым, як дарога, і дае магчымасьць пладзіцца ўсякаму пуста зельлю. Вядомая рэч, што на такой глебе ня можа чакаць добрага ўраджаю.

Гэтае мерапрыемства ў справе падвышэньня ўраджайнасьці павінна быць шырока прыстасавана ўсімі, тады мы з посьпехам здолеем выканаць аграмінімум.

**Ц. З.**

## Аршаншчына разгортвае падрыхтоўку да ўборачнай

На Аршаншчыне ўжо пачалася падрыхтоўка да ўборкі ўраджаю і да асеньняй пасеўнай кампаніі. Гэтымі днямі райкомам партыі зацьверджан плян уборкі і яго ўжо пачалі даводзіць да сельсавету, калгасу і вёскі. Па пляну прадугледжваецца дагляд за яравымі, як поліва гародніны і лёну, абсушка бульбы і кораньплодаў.

Уборку сенажаці мяркуецца правесьці такім чынам, каб мець два ўкосы.

Згодна пляну ўборачны інвэнтар будзе адрамантаваны да 15 ліпеня. Частка яго, якая патрэбна для ўборкі снажацяй і траў, будзе адрамантавана раней; астатнія ўборачныя апрацовачныя і зерняачышчальныя машыны будуць адрамантаваны да пачатку ўборкі азімны. Усе калгасы і саўгасы для правядзеньня рамонту прымацаваны да майстэрняў, якія ёсьць у саўгасах і калгасах. Тут будзе праводзіцца нескладаны рамонт, а больш складаны рамонт будзе праводзіцца на чыгуначналіцейным заводзе ў Воршы, на Белдрэсе, на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» і ў Дэпо ст. Ворша. Прымацаваньне калгасаў і саўгасаў да гэтых прадпрыемстваў па рамонту ўжо праведзена, таксама праводзіцца і прымацаваньне сельсаветаў да майстэрняў саўгасаў і калгасаў для рамонту інвэнтара аднаасобнага сэктару.

Па пляну ў гэтым годзе будзе засіласавана па ўсіх сэктарах 16,08 тон сілосу. Пабудова сілосных установак будзе скончана да 1 ліпеня. З дзесятага чэрвеня ў раёне пачынаюць працаваць курсы па падрыхтоўцы майстраў 110 чалавек.

Для таго, каб дабіцца поўнага выкананьня вызначаных па пляну мерапрыемстваў па ўборцы ўраджаю і па асеньняй пасеўкампаніі, з 5 чэрвеня ў сельсаветы, калгасы і саўгасы накіроўваецца 50 чалавек партыйна-камсамольскага актыву, якія там на месцы дапамогуць правесьці падрыхтоўку, а пасьля арганізаваць уборку і асеньнюю пасеўкампанію з тым, каб яна была праведзена пасьпяхова і дала яшчэ больш прыліў бядняцка-сераднякіх мас раёну ў калгасы.

Зьдзельшчына ў калгасах у час весняной сяўбы дала значныя вынікі, дапамагла ім скончыць сяўбу да тэрміну. З 15 чэрвеня будзе праведзена кампанія ўліку дасягненьняў ад зьдзельшчыны і папулярызацыі іх.

21 чэрвеня будзе скліканы раённы зьлёт калгасьнікаў, а 22 чэрвеня раённы зьлёт калгасьніц і жанчын-бяднячак і сераднячак аднаасобніц, дзе таксама будуць абагавораны ўсе задачы ўборачнай і пасеўнай кампаніі, а таксама і плянавыя мерапрыемствы па гэтых кампаніях. З 25 чэрвеня на 1 ліпеня будзе праводзіцца кампанія абгаварэньня вынікаў весняной сяўбы ў калгасах. Калгасы будуць рабіць справаздачу перад аднаасобнікамі. На гэтых сходах будуць абгаворвацца мерапрыемствы дапамогі аднаасобнікамі—калгасам і саўгасам.

Зараз у сельсаветы накіроўваюцца спэцыялісты сельскай гаспадаркі для складаньня плянаў уборкі і асеньняй сяўбы ў калгасах. Шэфскія арганізацыі таксама прымуць удзел ва ўборцы і сяўбе, шляхам дапамогі сваім падшэфным сельсаветам, калгасам і вёскам. Зараз шэфы заняты распрацоўкай пляну, што даручана ім райкомам партыі.

Па раёне пачаўся дакладны вучот уборачнага і зерняачышчальнага інвэнтара, каб пасьля яго можна было скарыстаць з поўнай нагрузкай, арганізаваць работу ў 2-3 зьмены і праводзіць хуткія перакідкі з калгасу ў калгас і г. д.

**Кудрын.**

## Чаму ня рыхтуюцца да ўборкі?

Зусім ня рыхтуецца да ўборачнай кампаніі Голацкі сельсавет, Сьмілавіцкага раёну. Да рамонту с.-г. інвэнтара як калгасы, так і аднаасобны сэктар яшчэ не прыступілі. Ня прывезены ў парадак і не агледжаны памяшканьні для складу сена і збожжа. На апошнім паседжаньні прэзыдыуму сельсавету пытаньне аб уборачнай кампаніі яшчэ ня ставілася. А ўжо даўно падышоў час, каб заняцца падрыхтоўкай да гэтай важнай кампаніі.

**К-р.**

## Дагаворы павінны быць выкананы

**БАБРУЙСК (Наш кар.).** Становішча з выкананьнем догавораў па аказаньні дапамогі рабочай сілай прыгараднай фэрме Цэрабкопу і на сёньня стаіць вельмі кепска. Гэтае невыкананьне пагражае вялікім прарывам у сканчэньні плянаў работы на фэрме. Асобныя прафсаюзныя арганізацыі ў гэтым пытаньні праяўляюць поўную бязьдзейнасьць, недаацэнку значэньня прыгараднай гаспадаркі ў палепшаньні рабочага забесьпячэньня.

Нашы буйнейшыя прадпрыемствы, якія павінны былі-б быць прыкладнымі ў выкананьні догавораў, ганебна цягнуцца ў хвасьце. Так, камбінат, які налічвае ў сябе каля 4 тысяч рабочых, паслаў толькі дзесятую частку рабочых на работу ў прыгарадную гаспадарку. За дзьве з паловаю дэкады мая месяца па швэйнай фабрыцы адпрацавала 50 проц. той колькасьці рабочых, якую фабрыка павінна была даць, па саюзе будаўнікоў—10 проц., па саюзе працасьветы—8-9 проц. і г. д.

Кожны дзень на прыгараднай гаспадарцы павінны працаваць больш 300 рабочых, а на самай справе яўка рабочых па асобных днёх зьніжаецца да сотні і менш.

Такое становішча ня можа быць ні ў якім разе цярпімым. Хуткае заканчэньне сяўбы на прыгараднай гаспадарцы патрабуе выкананьня ўзятых на сябе калектывамі працоўных абавязкаў.

Бяз гэтага нельга чакаць пасьпяховага ходу сяўбовых работ і, наогул, работы на прыгараднай гаспадарцы.

**Д. А.**

## УДАРНІКІ „БАЛЬШАВІКА“ ЗАКЛІКАЮЦЬ

**менскі завод „Камунар“, гомельскі завод „Пралетары“ і ўсе адстаючыя прадпрыемствы БССР: „Зварушэцеся, праверце свае рады, вызвальцеся ад лжэўдарнікаў, мабілізуйце сябе на пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, бязьлітасна выганьце ўсялякія праваапартуністычныя і „лявацкія“ хістаньні ў сваіх радох. Пры гэтых умовах посьпех вашай барацьбы будзе забясьпечаны. Атрыманыя вамі пераходныя сьцягі імя ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ у небясьпецы. Калі вы не падцягнецеся—вы можаце іх згубіць“.**

**„ПРЫНЦЫП САЦСПАБОРНІЦТВА — ТАВАРЫСКАЯ ДАПАМОГА АДСТАЎШЫМ З БОКУ ПЕРАДАВЫХ“ (СТАЛІН)**

# Прымеце заклік чырвоаштандарнага „Бальшавіка“

**Зварот рабочых, работніц, інжынэрна - тэхнічнага пэрсаналу і служачых Менскага чырвонаштандарнага скурзаводу „Бальшавік“**

## Дарагія таварышы!

Наш завод за бальшавіцкія тэмпы выкананьня прамфінпляну ва ўдарным квартале (кастрычнік-сьнежань 1930 г.) узнагароджан на Усебеларускім конкурсе пераходным сьцягам імя ЦСПСБ.

Мы дасягнутыя намі тэмпы ва ўдарным квартале захавалі і ў 3-м рашаючым годзе пяцігодкі.

Наш прамфінплян на 1-е паўгодзьдзе 1931 г. павялічан у параўнаньні з прамфінпляном мінулага году на 22,81 проц.

**Ня гледзячы на такую напружанасьць мы пасьпяхова спраўляемся з яго выкананьнем.**

За 5 мінулых месяцаў (студзень-май) мы свой прамфінплян выканалі на 100,16 проц. у колькасным выражэньні, і на 102,82 проц. у якасным выражэньні.

Ня горш абстаіць у нас справа і са зьніжэньнем сабекошту.

За гэтыя-ж 5 месяцаў мы зьнізілі сабекошт на 5,63 проц. замест прадугледжаных плянам 3,6 проц. зьніжэньня.

Такія посьпехі ў зьніжэньні сабекошту намі дасягнуты на аснове барацьбы за палепшаньне якасьці прадукцыі.

Па асноўным паказьніку якасьці прадукцыі ў скураной прамысловасьці па адхіленьні гатунковасьці гатовай прадукцыі ў параўнаньні з гатунковасьцю атрымліваемай сыравіны, мы дабіліся значных дасягненьняў.

Па апойку чорнаму, замест меўшага месца ў першым паўгодзьдзі 1930 г. адхіленьня гатунковасьці на 13,7 проц., мы за мінулыя 5 месяцаў маем адхіленьне толькі на 1,49 проц.

Па апойку каляровому, замест мінулагодняга адхіленьня на 13,2 пр., дабіліся адхіленьня толькі на 0,55 проц.

Па выростку, замест адхіленьня ад гатунковасьці на 18,05 проц., **мы маем ня толькі адхіленьне ад гатунковасьці, але нават падвышэньне гатунковасьці на 1,48 проц.**

Па шаўрэту мы таксама маем, замест адхіленьня на 17,02 проц., **падвышэньне гатунковасьці на цэлых 5,45 проц.**

Перагляд норм і расцэнак, дзякуючы шырокай хвалі сустрэчных норм з боку нашых ударных брыгад, і рацыяналізацыі працэсаў вытворчасьці, даў нам ўшчыльненьне норм на 12,86 проц. і зьніжэньне расцэнак на 11,47 проц.

Эканамічны эфэкт па зьдзельным фондзе зарплаты ў адпаведнасьці з плянавым асартымэнтам сыравіны складае 61.250 р. замест намечаных па пляну 45.073 руб.

Свае заданьні па прамфінпляну мы выканалі пры зьмяншэньні колькасьці рабочых на 3,4 проц. супроць намечанага па пляну і пры наяўнасьці на заводзе 30 проц. рабочых пры шоўшых, у сувязі з цякучасьцю рабсілы, на завод на працяту апошняга году.

**Зараз мы вядзем на заводзе штурм за датэрміновае выкананьне прамфінпляну 1-га паўгодзьдзя 3-га рашаючага году пяцігодкі.**

Мы выпрацавалі канкрэтныя заданьні для кожнага ўдарніка з такім разьлікам, каб заданьне па прамфінпляну было выканана да 28 чэрвеня.

Усіх сваіх посьпехаў мы дабіліся дзякуючы вялізарнаму энтузіязму і творчай актыўнасьці ўдарнікаў нашага заводу.

86,1 проц. усіх рабочых састаяць ва ўдарных брыгадах.

53,1 проц. ударнікаў прэміраваны за бальшавіцкія ўзоры работы.

Мы здолелі накіраваць энтузіязм і актыўнасьць рабочай масы на пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі толькі дзякуючы рашучай перабудове ўсёй партыйнай, прафсаюзнай і гаспадарчай работы на заводзе.

Цэхі ў нас пераведзены на поўны гаспадарчы разьлік.

Адзнаначальле цьвёрда праводзіцца па ўсіх брыгадах.

Кожная брыгада, як-бы малакольксна яна ні была, мае свае гаспадарчае, партыйнае і прафсаюзнае кіраўніцтва.

**Гэтыя нізавыя брыгадныя трыкутнікі вынесьлі на сваіх плячох увесь цяжар барацьбы за выкананьне прамфінпляну.**

У нас на заводзе маецца яшчэ рад недахопаў і правалаў у рабоце.

У выкананьні прамфінпляну маецца вялізарная зьвязаваднасьць па між паасобнымі пяцідзёнкамі.

Усё яшчэ маюцца хістаньні ў якасьці прадукцыі: паміж добрымі па якасьці партыямі без асаблівых грунтоўных прычын атрымліваюцца асобныя партыі нізкай якасьці.

У прагулах мы дапусьцілі, хаця і нязначнае, але павялічэньне супроць ударнага кварталу.

Прагулы ва ўдарным квартале ў нас склалі 0,17 проц., а за мінулыя 5 месяцаў яны вырасьлі да 0,18 пр.

Культурна-масавая работа сярод работніц праводзіцца недастаткова. І гэта ў той час, калі работніцы складаюць на нашым заводзе 28 проц. усіх рабочых.

**Слабасьці ў нашай рабоце ёсьць і мы іх ня тоім.**

Наадварот, на аснове самай жорсткай пралетарскай самакрытыкі, мы ўсе свае недахопы ўскрываем, каб мабілізавацца на іх зьнішчэньне.

Энтузіязм рабочай масы, правільнасьць пастаноўкі партыйна-масавай, прафсаюзнай і гаспадарчай работы забясьпечвае нам посьпехі в кварталу ў квартал.

Ва ўдарным квартале вы, рабочыя «Камунару» і «Пралетарыя», разам з намі ня кепска біліся за бальшавіцкія тэмпы выкананьня прамфінпляну.

Вы заслужана атрымалі пераходны сьцяг імя ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ.

Зараз мы даведаліся, што вы дапусьцілі ганебныя прарывы ў выкананьні прамфінпляну 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Ва ўдарным квартале вы давялі, што вы здольны біцца за генэральную лінію партыі.

**Таму вы ня маеце права адставаць.**

На практыцы нашай ўласнай барацьбы на заводзе мы пераканаліся, што пры правільнай мабілізацыі рабочых мас можна дабіцца посьпехаў ў выкананьні прамфінпляну.

У мінулым годзе наш завод меў прарывы ў выкананьні прамфінпляну яшчэ больш ганебныя, чым у вас зараз.

**Але калі мы, пачынаючы з сакавіка месяца мінулага году, замест праваапартуністычнай балбатні, якой займалася ранейшае кіраўніцтва заводу аб непасільнасьці тэмпаў, узяліся за работу па-бальшавіцку, дык хутка дабіліся посьпехаў.**

Мы зварочваемся да вас з закліком: зварухнецеся, праверце свае рады, вызвальцеся ад лжэўдарнікаў, мабілізуйцеся на пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, бязьлітасна выганьце ўсялякія праваапартуністычныя і «лявацкія» хістаньні ў сваіх радох.

**Пры гэтых умовах посьпех вашай барацьбы будзе забясьпечан.**

Мы памятаем указаньне т. Сталіна, што «прынцып сацспаборніцтва—таварыская дапамога адстаўшым з боку перадавых, каб дабіцца агульнага ўздыму».

Атрыманыя вамі пераходныя сьцягі імя ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ—у небясьпецы. **Калі вы не падцягнецеся, вы можаце іх згубіць.**

**Таму мы бярэм на сябе абавязак аказаць вам усю ад нас залежачую дапамогу ў перанясьненьні апраўдаўшага сябе ў нас вопыту работы на вашы заводы.**

Мы ўпэўнены, што наш заклік вы падтрымаеце і мы разам з вамі будзем біцца за пасьпяховае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі і давядзем рэальнасьць бальшавіцкіх тэмпаў 3-га рашаючага году пяцігодкі.

**Мы чакаем вашых водгукаў на наш заклік.**

**Сакратар парткалектыву Дзяціна.**

**Старшыня заўкому Данішэўскі.**

**Дырэктар заводу Кіршанблюм.**

## 15 процантаў не дадала прамысловасьць БССР за 5 месяцаў першага кварталу

Весткі па выкананьні прамфінпляну ў рэспубліканскай прамысловасьці гавораць аб тым, што гэта выкананьне ідзе вельмі марудным тэмпам.

**Па мэталяапрацоўчай прамысловасьці,** прамфінплян першага кварталу быў выкананы ўсяго на 51,4 проц., у красавіку месяцы плян выкананы на 50,5 проц., а ў маі—на 58,5 проц. Пяцімесячны плян (студзень—май) выкананы на 60 проц. і гадавы плян на 1-га чэрвеня выкананы толькі на 23,3 проц.

Ня лепш абстаіць справа і па іншых галінах прамысловасьці. У галіне **будматар'ялаў** мы маем наступныя зьвесткі. На **керамічнай** прамысловасьці прамфінплян першага кварталу выкананы на 93,5 проц., у красавіку месячны плян—на 78,3 проц. у маі—25,5 проц. Пяцімесячны плян (студзень—май выкананы на 63 проц. Гадавы плян на 1-га чэрвеня выкананы толькі на 12 проц.

Па **шклянай** прамысловасьці выкананьне прамфінпляну малюецца наступным чынам: першы квартал—64 проц., красавік—69,9 проц., май—74,6 проц. Пяцімесячны плян (студзень—май) 66,9 проц., гадавы плян—24,5 проц.

Па **фанэрнай** прамысловасьці: першы квартал—72,6 проц., красавік—68,2 проц., май—68,1 проц. Пяцімесячны плян (студзень—май)—70,9 проц., гадавы плян—30 проц.

Наогул па ўсіх відах будаматар'ялаў плян выкананы дрэнна: першы квартал—69 проц., красавік—69,6 проц., май—53 проц. Пяцімесячны плян—65,8 проц., гадавы—24,5 проц.

Ня лепш стаіць справа і па хэмічнай прамысловасьці. Першы квартал даў выкананьне прамфінпляну ў 54,2 проц., у красавіку—62,3 проц., у маі—68,1 проц. Пяцімесячны плян выкананы на 58,7 проц., гадавы плян—на 20,9 проц.

**Скураная** прамысловасьць прамфінплян першага кварталу выканала на 90,4 проц., плян красавіка—на 67,7 проц., майскі плян—на 94,4 проц. Пяцімесячны плян скураной прамысловасьці выкананы на 90,7 проц., гадавы плян—на 35,9 проц. Як бачым, скураная прамысловасьць, у параўнаньні з іншымі галінамі прамысловасьці, ідзе ўперад.

Прамфінплян першага кварталу ў **тэкстыльнай** прамысловасьці выкананы на 88,8 проц., у красавіку плян выкананы на 92,2 проц., у маі—на 90,1 проц. Пяцімесячны плян (студзень—май) выкананы на 89,7 проц., гадавы плян—на 28,8 проц.

Па **швэйнай** прамысловасьці ў першым квартале плян выкананы на 98,7 проц., плян красавіка—95,6 проц., майскі плян—119,2 проц. Пяцімесячны плян выкананы на 101,7 проц., гадавы плян—на 31,3 проц.

**Абутковая** прамысловасьць прамфінплян выканала: першы квартал—79,6 проц., красавік—85,7 проц., май 65,4 проц. Пяцімесячны плян—78,8 проц., гадавы плян — 29,8 проц.

Ня лепшы і на **галянтарэйнай** прамысловасьці. Плян першага кварталу выкананы на 93 проц., плян красавіка на 44 проц., майскі плян—на 34,7 Пяцімесячны плян выкананы толькі на 68,9 проц., гадавы—на 25,9 проц.

Значна адстае і **паліграфічная** прамысловасьць. Плян першага кварталу выкананы толькі на 77,9 проц., плян красавіка — 72,8 проц., плян мая—на 83 проц. Пяцімесячны плян (студзень-май) выкананы на 77,9 проц., гадавы плян—на 32,8 проц.

**Сярніковая** прамысловасьць у першым квартале плян выканала на 80,8 проц., у красавіку—на 80,3 проц., у маі—на 74,2 проц. Пяцімесячны плян выкананы на 79,4 проц. гадавы плян—на 34,2 проц. Як бачым, увесь час на сярніковай прамысловасьці тэмпы ідуць на зьніжэньне.

**Па ўсёй прамысловасьці ВСНГ** прамфінплян выкананы наступным чынам. Першы квартал—85,3 проц., красавік—81,8 проц., май—27,7 проц. Пяцімесячны плян (студзень—май)—85 проц., гадавы плян—29,5 проц.

15 процантаў недавыкананьня пляну па прамысловасьці, гаворыць аб тым, што яшчэ ня ўсё зроблена для таго каб мабілізава

## АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

### ПАСТАНОВА

**Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР**

**Аб арганізацыі раённых і гарадзкіх камісій па арганізаці фонду імя У. І. Леніна.**

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага камітэту БССР **пастанаўляе:**

1. **Прапанаваць** усім раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам арганізаваць пры райвыканкомах і гарсаветах раённыя і гарадзкія камісіі па арганізацыі фонду імя У. І. Леніна.

2. Гарадзкія камісіі па арганізацыі фонду У. І. Леніна ў гарадох Менску, Віцебску і Гомелі, а раённыя камісіі ў гарадох Магілеве, Бабруйску, Оршы, Барысаве, Полацку, Мазыры, Рэчыцы, Слуцку, Рагачове і Жлобіне арганізаваць у складзе 5 асоб, а ў астатніх мясцовасьцях з 3-х асоб.

Старшынямі раённых і гарадзкіх камісій назначаюцца пэрсанальна старшыні раённых выканаўчых камітэтаў і гарадзкіх саветаў.

3. Прапанаваць раённым і гарадзкім камісіям па арганізацыі фонду У. І. Леніна, якія арганізуюцца паводле гэтай пастановы, скласьці адпаведныя пляны работы і прыступіць да практычнага іх ажыцьцяўленьня на падставе дырэктыў Цэнтральнай Камісіі.

Старшыня Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сакратар Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР **М. Гіляке́віч.**

11 чэрвеня 1931 г.

### Пастанова

**Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР**

**Пра дапаўненьне Крымінальнага Кодэксу БССР арт. 121[1].**

У адпаведнасьці з арт. 6 пастановы ЦВК і СНК СССР за 9 красавіка 1931 г. «Пра ажыцьцяўленьне палажэньня аб вынаходках і тэхнічных удасконаленьнях» (З. З. СССР 1931 г., № 21, арт. 180) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць** дапоўніць Крымінальны Кодэкс артыкулам 121[1] у наступнай рэдакцыі:

«121[1] а) Заўкі за границаю без належнага дазволу вынаходак, зробленых у СССР, а таксама вынаходак зробленых за границаю савецкімі грамадзянамі, камандыраванымі дзяржаваю, выклікае—прымусовыя работы да аднаго году альбо штраф да 1.000 р.

б) Перадача без належнага дазволу за границу вынаходак, паказаных у п. «а», выклікае—пазбаўленьне волі да 10 гадоў з канфіскацыяй усяе альбо часткі маемасьці».

Старшыня Цэнтральнага выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галаадзед.**

Сакратар Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР **М. Гіляке́віч.**

5 чэрвеня 1931 г.

г. Менск.

### Пастанова

**Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР**

**пра зьмену пункта «а» пастановы пра зьмену парадку абскаржаньня прысудаў і пастаноў народных судоў.**

У адпаведнасьці з пастановаю ЦВК і СНК Саюзу ССР за 4 сакавіка 1931 г. «Пра парадак разгляду працоўных спрэчак батракоў і пастухоў з наймальнікамі» (З. З. СССР 1931 г. № 15, арт. 144) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць** пункта «а» пастановы ЦВК і СНК БССР за 25 сьнежня 1930 г. «Пра зьмену парадку абскаржаньня прысудаў і пастаноў народных судоў» (З. З. БССР 1931 г. № 1, паст. 3) запісаць у наступнай рэдакцыі:

«а) Пастаноў па працоўных спрэчках на суму ня больш 50 рублёў паміж батракамі і пастухамі з наймальнікамі—індывідуальнымі сялянскімі гаспадаркамі, а таксама пастаноў па іншых працоўных справах, калі сума грашовага іску аб заработнай плаце не перавышае месячнага заработку працоўніка і калі гэты іск не зьвязан са звальненьнем».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галаадзед.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **М. Гіляке́віч.**

5 чэрвеня 1931 г.

г. Менск.

### Пастанова

**Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР**

**Пра зьмену законадаўства Саюзу ССР у сувязі з пастановаю ЦВК і СНК СССР за 4-га сакавіка 1931 г. «Пра зьмену законадаўства Саюзу ССР у сувязі з пастановаю ЦВК і СНК Саюзу ССР пра падатковую рэформу і пра парадак фінансаваньня дарожнай гаспадаркі і пра арганізацыю дарожна-будаўнічых кантор».**

У здпаведнасьці з пастановаю ЦВК і СНК Саюзу ССР за 4 сакавіка 1931 г. «Пра зьмену законадаўства Саюзу ССР у сувязі з пастановаю ЦВК і СНК Саюзу ССР пра падатковую рэформу і пра парадак фінансаваньня дарожнай гаспадаркі і пра арганізацыю дарожна-будаўнічых кантор» (З. З. СССР 1931 г. № 15, арт. 147) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляюць:**

1. Скасаваць: пастанову СНК БССР за 17 сакавіка 1930 г. «Пра парадак вырашэньня спрэчак аб разьмерах удзелу прадпрыемстваў і арганізацый у выдатках на будаваньне, рамонт і ўтрыманьне дарог мясцовага значэньня» (З. З. БССР 1930 г. № 18, паст. 118); Палажэньне пра дарожны рэспубліканскі фонд (З. З. БССР 1929 г., № 10, паст. 55); артыкул 28[1] Палажэньня пра мясцовыя фінансы БССР (З. З. БССР 1928 г. № 38, арт. 368).

2. Запісаць арт. 111[1]) Палажэньня пра мясцовыя фінансы БССР (З. З. БССР 1930 г., № 9, паст. 60) у наступнай рэдакцыі:

«111[1]). Мясцовыя дарожныя фонды ўтвараюцца на падставе асобнага закона».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **Грысевіч.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчга Камітэту БССР **М. Гіляке́віч.**

5 чэрвеня 1931 г. г. Менск.

# ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

### Нічога ня робіцца на пераходзе на гаспадарчы разьлік

**ВІЦЕБСК, 13-VI. (БЕЛТА).** Віцебская прыстань, па перавозцы грузаў за май выканала толькі 80 проц. заданьня. Пры чыны гэтага—несваечасовая нагрузка і выгрузка, прастоі суднаў па 12-15 г., невыкананьне кліентурай дагавароў, слабая працдысцыпліна, адсутнасьць культмасавай работы. Асабліва ганебна адстае паравое судно «Вялса», якое выканала прамфінплян толькі на 51,8 проц. Дрэнна пастаўлена работа па вучоту і справаздачнасьці на суднах. Партячэйкі не арганізаваны на кожным судне, культмасавая работа адсутнічае, насьценгазэта выходзіць раз у тры месяцы. Нічога ня робіцца па пераходу на гаспадарчы разрахунак. Яшчэ не ўстаноўлены цьвёрдыя нормы і вучот выдаткаваньня апалу. Фармальна ахоплена сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам каля 50 проц. рабочых, але вучоту сацспаборніцтва не вядзецца.

### Рабкоры Бярэзінскага камбінату—Усебеларускаму зьезду рабселькораў

**БАБРУЙСК, 13-VI.** Рабкоры Бярэзінскага Камбінату ў падарунак Усебеларускаму зьезду рабселькораў абавязаліся перабудаваць сваю работу на брыгадным мэтадзе, не пасляблячы работу з рабкорамі—адзіночкамі. Вядзецца ўпартая работа за ўцягненьне ў рады рабкораў да Усебеларускага зьезду 150 лепшых ударнікаў мужчын і 75 жанчын.

Рабкоры Бярэзінскага камбінату разам з камсамолам арганізавалі скразны кантроль над якасьцю экспартнай прадукцыі.

У адказ на заклік ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы кадраў друку рабкоры Бярэзінскага камбінату вылучылі з свайго калектыву 3-х лепшых ударнікаў рабкораў для работы ў раённым і цэнтральным друку і адпрацавалі па 3 гадзіны на карысьць вязьвога друку.

### Патрабуем жорсткай кары да забойцаў

**3 чэрвеня у калгасе «Ільіч» Жыліхаўскага сельсавету, Чырвона-Слабодзкага раёну, забіты актывіст—ударнік калгасу тав. Скарбіч Х. К. Забілі, як выявілася, сыны б. вурадніка Мяшэчка—Алесь і Павал і кулак Юруц Ігналь і Алешкевіч Уладзімер. Кулакі—забойцы імкнуліся гэтым забойствам спыніць пасьпяховы калгасны рух.**

**Агульны сход калгаснікаў калгасу «Ільіч» патрабуе—да кулакоў тэрарыстаў, ужыць вышэйшую меру пакараньня.**

**Сем'і забойцаў—Мяшэчкаў, якія нейкім чынам пралезьлі ў калгас, з калгасу выключаны. Адначасова з гэтым агульны сход калгаснікаў узьняў хадайніцтва перад ЦВК БССР аб высяленьні сем'яў забойцаў—тэрарыстаў за межы БССР.**

### Віды на надвор'е

Бюро надвор'я СССР паведамляе наступныя віды на надвор'е на час да сярэдзіны жніўня. БССР у адносінах надвор'я падзяляецца на дзьве часткі: паўднёва-ўсходняя і паўночна-заходняя (па мяжы прыблізна па напрамку Віцебск - Петрыкаў).

У паўднёва-ўсходняй частцы чакаецца пераважна гарачае, яснае ўстойлівае надвор'е з даволі моцным разьвіцьцём навальнічнай дзейнасьці.

У паўночна-заходняй—лета будзе больш прахладнае з нестойлівым надвор'ем у перамешку з успышкамі гарачыні. Навальнічная дзейнасьць у гэтай частцы БССР можа таксама выяўляцца ў даволі моцнай форме.

### Плян ліквідацыі няпісьменнасьці ў Васілевіцкім сельсавеце сарваны

У шмат якіх сельсаветах Рэчыцкага раёну ліквідацыя няпісьменнасьці яшчэ далёка не стаіць на належнай вышыні. У некаторых сельсаветах яна амаль на зрыве. Да прыкладу узяць Васілевіцкі сельсавет, цэнтр якога м. Васілевічы зьяўляецца адным з самых буйных мястэчак у культурных адносінах у БССР. Тут маецца цэлы рад навуковых устаноў, саюзных і грамадзкіх арганізацый, маецца торфазавод і г. д. Але-ж, ня гледзячы на ўсе гэтыя абставіны, такая важная задача, як барацьба за суцэльную пісьменнасьць, зрываецца. Усяго няпісьменных налічвалася па сельсавеце каля 500 чалавек. Спачатку навучальнага году былі арганізаваны ліквпункты, няпісьменныя прымацаваны былі да вучняў ШКМ, Леспрафшколы, Лесхімшколы і г. д. Словам выходзіла, што ўсе да вясны 1931 года будуць пісьменнымі. Але зусім інакш аказалася на весну: замест 100 проц. ліквідацыі няпісьменнасьці—**усяго скончыла ліквпункты 72 чалавека, ці прыблізна—14,4 проц.**

А пра вынікі індывідуальнага навучаньня і гаварыць ня прыходзіцца. Тлумачыцца гэта, перш за ўсё, слабой зацікаўленасьцю самых настаўнікаў, а падругое, бязьдзейнасьцю шмат якіх прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый. Ні саюз чыгуначнікаў, ні Вучлесгас, ні саюз Мэдсанпрацы, ні заўком «Закрашынскага Мха»—ніхто не паклапаціўся найсьці насустрэч, каб дапамагчы справе ліквідацыі няпісьменнасьці. Так, пры заводзе «Закрашынскі Мох» быў арганізаваны ліквпункт, кіраўніком якога **зьяўляўся б. поп Цытовіч** і калі апошні быў зьняты з работы, заўком нават і не зварушыўся, у ніякіх мер да гэтага ні аднаго скончыўшага. Ліквпункту на заводзе няма. Трэба хоць зараз пры заводзе арганізаваць ліквпункты, бо каля 2-х тысяч рабочых торфазаводу патрабуюць гэтага, ліквпункты будуць працаваць і летам, трэба толькі разварушыцца.

**В. Панізмароў.**

### Пазбавіць райкалгассаюз ад кулацкага агента

9 мая г. г. у рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» паступіў допіс пад назвай «Падкулачнікаў і кулакоў патрэбна сурова пакараць» у гэтым допісе паведамлялася, што ў в. Мікулічы, Нігацінскага сельсавету, Бярэзінскага р. у новым калгасе імя Фрунзе маюцца кулакі, якія разбураюць калгас. Гэты допіс быў пасланы Бярэзінскаму Райкалгассаюзу для праверкі нададзеных фактаў і прыняцьця адпаведных мер.

Аднак, Бярэзінскі Райкалгассаюз у асобе яго старшыні, абмежаваўся наступнай бюракратычнай адпіскай. «Тав. Лепніцкі, зьвярнуць у рэдакцыю. Заметка зусім сапраўдная і аб гэтым вядома арганізацыям якія маглі-б пакараць, але да гэтага часу пакуль, што да іх не ніякі крокаў не прынята з боку пакараньня». Вось агіднейшы праваапартуністычны падыход да справы. Старшыня Райкалгассаюзу добра ведае аб тым, што у калгасе маюцца кулакі, што яны разбураюць калгас і ніякіх мер не прымае. На рабселькораўскі допіс па бюракратычнаму адпісваецца. Такім чынам старшыня Бярэзінскага Райкалгассаюзу прымірэнча аднёсься да разбурэньня калгасу варожым элемэнтам чым фактычна дазваляе кулаком і надалей разбураць калгас.

Мы патрабуем ад Бярэзінскага РК КП(б)Б і РКК РСІ прыняць належныя меры да таго каб ачысьціць калгас імя Фрунзе ад варожых элемэнтаў—кулакоў, а Райкалгассаюз ад кулацкага саюзьніка, які сядзіць на пасадзе старшыні Райкалгассаюзу.

**Ладуцька.**

### Даць рашучы адпор

У м. Ухвалы, Крупскага раёну пры сельсавеце выходзіць насьценгазэта «Наша вёска». Газэта са ўсёй бальшавіцкай рашучасьцю павяла барацьбу з недахопамі ў рабоце мясцовых арганізацый, а таксама вядзе рашучае змаганьне з рэшткамі праваапартуністычнай практыкі, якая мела месца у практыцы былога складу Бюро Ухвальскай ячэйкі КП(б)Б. Але крытыка разгорнутая газэтаю «Наша вёска» не падабаецца асобным членам КП(б)Б асабліва б. сакратару тав. Ільлюшыну Аўсею.

Адзін раз у насьценгазэце быў зьмешчаны артыкул, аб тым што тав. Ільлюшын, як старшыня калгасу дрэнна кіруе калгасам. За гэты допіс тав. Ільлюшын накінуўся з лаянкаю на старшыню рэдкалегіі тав. Міхеева Д. і імкнуўся яго пабіць.

Вось, як аднёсься да крытыкі праз друк былы кіраўнік Ухвальскай мясцовай партарганізацыі. Ячэйка КП(б)Б гэты наскок тав. Ільлюшына на тав. Міхеева ведае, але-ж ніякіх мер да яго не прыняла.

Крупскаму РК КП(б)Б неабходна зьвярнуць увагу на справу рэагаваньня на рабселькораўскія допісы, а таксама адбіць ахвоту у тав. Ільлюшына, нападаць на рэдкалегію.

**Селькор.**

### Змагаюцца за суцэльную пісьменнасьць

У Дукорскім сельсавеце (Сьмілаўскі р.) ёсьць тры навучальныя ўстановы: рабфак, ШКМ і пэдкурсы. Для лепшага правядзеньня работы па культэстафэце гэтыя навучальныя ўстановы падзялілі паміж сабой насельніцкія пункты сельсавету і заключылі сацумовы.

Рабфак узяўся абслугоўваць 5 пунктаў, ШКМ—10 і пэдкурсы—6 пунктаў Ва ўсіх пунктах праведена ўжо шмат работы. Рабфакаўцы ў вёсцы Харавічы ўцягнулі няпісьменных на ліквпункты, да некаторых прымацавалі культармейцаў для індывідуальнага навучаньня, наладзілі работу чырвонага кутка і завербавалі 40 падпісчыкаў на газэты.

Не адсталі і вучні ШКМ, якія вышлі ў калгас імя «Х зьезду камсамолу» і падшэфныя вёскі праводзяць культработу. У трох паселішчах ужо на 100 проц. ліквідуецца няпісьменнасьць і ахоплены падпіскай на газэты. Студэнты пэдкурсаў таксама прыступілі да практычнай культработы.

Студэнт **Я.**

## Гастролі БДТ 2 у Маскве

**(Ад уласнага карэсп.)**

6-га чэрвеня ў Маскве ў памяшканьні МХАТ'у 2 (пляц Сьвярдлова) пачаліся паказам п'есы «Качагары» гастролі БДТ 2. Перад паказам з дакладам пра тэатральнае будаўніцтва ў БССР выступіў дырэктар БДТ 2 т. Вольскі. Паказы тэатру ў Маскве карыстаюцца сярод працоўных надзвычайным посьпехам. Усе спэктаклі п'есы «Качагары» і «На прадвесьні» распроданы па прафсаюзных арганізацыях да канца гастроляў.

8-га чэрвеня адбылося арганізаванае наведваньне тэатру прэміраванымі ўдарнікамі-мэталістамі заводу Масквы. БДТ 2 перад паказам вітаў масквоўскіх ударнікаў ад імя працоўных БССР.

Тэатр наведваюць з зацікаўленасьцю замежныя рабочыя і спэцыялісты. Былі на паказах прадстаўнікі бэльгійскай Чырвонай Блюзы. Матар'ялы аб працы БДТ 2 пасланы для друку ў французкі часопіс «Ле монд». (Парыж) пад рэдакцыяй Анры Барбюса і ў бэльгійскі часопіс «Проспектэн» (Брюсэль).

БДТ 2 наведала ў поўным складзе Усесаюзная канфэрэнцыя асацыяцыі новых рэжысэраў. 13 чэрвеня ў цэнтральным тэатральным клюбе адбудзецца ўрачыстае спатканьне БДТ 2 з працаўнікамі маскоўскіх тэатраў. 14 чэрвеня адбудзецца дыспут прысьвечаны абгаварэньню працы БДТ 2.

Тэатр распрацаваў плян культылазак у Чырвоную армію і на заводы.

### ПРЫЁМ У ЎПАЎНАВАЖАНАГА НК ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ СССР

Часова Выконваючы НК Замежных спраў СССР пры Ўрадзе БССР т. Я. Т. Густыр учора прыняў з візытам нанова прызначанага Латвійскага консула ў Віцебску п. Фр. Фрыдэнберга.

## Ачысьціць рады навуковых працаўнікоў ад нацдэмаў

**Віцебск.** 13-VI. (Белта). Бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў заслухала даклад аб рабоце Дзяржаўнага культурна-гістарычнага музэю. За ўвесь час свайго існаваньня з 1925 году музэй быў абсалютна аналітычным, адарваным ад сучасьнасьці і фактычна зьяўляўся кунсткамэрай, а не навуковай культурнай савецкай ўстановай. Былое кіраўніцтва музэем змазвала клясавую барацьбу ў вёсцы, папуляры завала беларускую самабытнасьць, праводзіла арыентацыю за Захад, інфарвала ўсё савецкае, папулярызавала польска-буржуазную культуру.

Новае кіраўніцтва музэю з лістаападу 1930 году прыступіла да карэннай рэарганізацыі яго работы ў адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва. Застаўшыяся старыя навуковыя працаўнікі ня толькі не дапамагалі гэтай справе, а усімі сродкамі абаранялі старыя мэтады і зьмест работы, сабатавалі новыя пачынаньні.

Бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў пастанавіла тэрміново адпаліць склад навуковых супрацоўнікаў музэю, якія зьяўляюцца клясава-варожымі. **Багародзкага Н. Н.,** былога чорнасоценца, сабатаваўшага мерапрыемствы па рэарганізацыі музэю, насаджаўшага нацдэмакратызм, у экспазыцыі, бюро сэкцыі пастанавіла зьняць з работы ў музэі, выключыць з сэкцыі і паставіць пытаньне перад Гарсаветам аб зьняцьці яго з работы ў школе. Зьняць з работы ў музэі і выключыць з сэкцыі так сама і **Дабравольскі В. В.**

Бюро сэкцыі зацьвердзіла плян работы музэю на 1931 г. даўшы паказаньні на канчатковае выкарчоўваньне рэшткаў беларускага нацдэмакратызму і перабудовы работы ў адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

## „Дзень школы" ў Менску

Сёньня «Дзень школы» заканчваецца падагульваньнем вынікаў работы школ у летнім садзе «Прафінтэрн», дзе з удзелам партыйных, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый будуць прэміраваны лепшыя культустановы, лепшыя ўдарнікі - асьветнікі.

На гэтым-жа вечары адбудзецца ўрачыстае адчыненьне агульна-гарадзкой канфэрэнцыі асьветнікаў. На канфэрэнцыі будуць падагулены вынікі навучальнага году і яна працягнецца да 17 чэрвеня.

### Не загружаць транспарт непатрэбнымі перасылкамі

Беларускае агенства «Белтэлеграма» з в. Сялёба, Сьвіслаўскага раёну, паслала Менскай канторы «Бел'яйка» тры скрынкі яек наложным плацяжом. Яйкі аказаліся тухлымі. «Бел'яйка», замест таго, каб скласьці акт і на-магчы масьці скарыстаць гэтыя яйкі на тэхнічныя патрэбы на фабрыцы, зварочвае іх Сьвіслацкаму райкаапсаюзу назад наложным плацяжом на суму 400 руб. Райкаапсаюзу прыходзіцца выкупляць псаваныя яйкі за 400 руб. дзл таго, каб закапаць іх у зямлю.

Час спыніць загрузку транспарту галавацяпскімі перасылкамі і больш шчадна адносіцца да дзяржаўных грошай.

**А. Гарэцкі.**

## АПАВЯШЧЭНЬНЕ

**Дом Пісьменьніка (Савецкая, 68)**

— 15-га чэрвеня а 7 гадзіне ўпечары адбудзецца агульны сход МЕНАППу.

1. Даклады—рапарты часопісу «Маладняк», «Полымя», «Чырвоная Беларусь»,—і садаклады брыгад МЕНАППу.

Запрашаюцца рабочыя друкарні імя Сталіна, рабочыя літгуртко́ўцы, Праўленьне БДВ, аспіранты, студэнты, выкладчыкі літаратуры.

Менаппаўцам і студыйцам прысутнасьць абавязкова.

**Сакратарыят МЕНАПП.**

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.


| | |
|---|---|
| Менскі 2 Дзяржтэатр | Сёньня Опэра „Залаты пеўнік" Р. КОРСАКОВА. Білеты ў рабкасе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 5 г. Пачатак а 9 гадз. — Дзеці да 16 г. не дапушчаюцца. |
| Дзяржцырк | Сёньня і штодзённа ВЯЛІКІ ЦЫРКАВЫ ПАКАЗ Савецкі атракцыён „Сав" Электрычны ваўчок і шмат інш. нумароў. Пачат. а 8 г. 45 х. увечары. Льготныя білеты ў рабкасе |
| „Чырвоная Зорка" | 2 карціны ў 1 сэанс 1. Злачынства гр. Суркова. 2. Чарлі Чаплін у тэатры (камэдыя). Пачатак а 7 гадз. |
| Кіно-тэатр „Культура" | Нямецкі фільм Пасынкі Бэрліна. Звыш праграмы хроніка—Саюзкіно. Пачатак а 7 гадзіне. |
| Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" | Замежны фільм Трагэдыя акрабата. Пачатак а 7 гадз. Каса ад 5 гадз. |
| Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" | 2 фільмы ў 1 сэанс 1. Чашка гарбаты—ў 5 ч. (Ігор Ільінскі) 2. Скрозь полымя—ў 5 ч. (Рычард Толмедж) Пачатак а 2, 3,45, 7. 8,45 і 10.30 |

БЕЛДЗЯРЖСНАБ

прыймае ад зацікаўленых устаноў

заяўкі на незгараемыя шафы і сундукі

на III—IV квартал 1931 г.

Заяўкі павінны быць прадстаўлены не пазьней 15-VI г. г.

Установы і арганізацыі, не прадставіўшыя да тэрміну заявак, будуць пазбаўлены атрыманьня апошніх

Разьмер шафаў—1+1 67×63×50 см . . . 450 р. сундукоў—№ 8 65×55×52 см . . . 200 р.

БЕЛДЗЯРЖСНАБ.

Лужасьнянскі Дзяржаўны С.-Г. Тэхнікум валакністых культур

АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ ЗАЯЎ НА АДДЗЯЛЕНЬНІ КУЛЬТУРЫ ЛЕНУ.

Да заявы дадаюцца:

1) Дакуманты аб адукацыі. 2) Аб сацстановішчы. 3) Аб здароўі. 4) Аб узросьце. 5) Дзьве фотакарткі. 6) Анкета.

Заняткі пачнуцца з першага кастрычніка г. г. Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатамі, стыпэндыі на 60 проц.

Заявы накіроўваць: Віцебск, Лужасьнян каму с.-г. тэхнікуму.

Дырэктар тэхнікуму МАРОЗАЎ.

Белкантора і Менскае Аддзяленьне Дзяржбанку ПАВЕДАМЛЯЕ,

што згодна пастановы СНК БССР усе ўстановы і прадпрыемствы,

МАЮЧЫЯ КАНТАКАРЭНТ,

павінны прадстаўляць касавыя пляны:

МЕСЯЧНЫЯ АПЭРАЦЫЙНЫЯ ДА 15 ЧЫСЛА ПРАДІЛЯНУЕМАГА МЕСЯЦА.

КВАРТАЛЬНЫЯ ДА 15 ЧЫСЛА Ў АПОШНІ МЕСЯЦ ПЛЯНУЕМАГА КВАРТАЛУ.

На ліпень месяц і на 3-ці квартал павінны прадставіць касавыя пляны да 15 чэрвеня 1931 г.

Не прадстаўленьне касавых плянаў у вызначаныя тэрміны пацягне спыненьне выдачы наяўных грошай з кас банку.

У далейшым банк ніякіх папярэджаньняў рабіць НЯ БУДЗЕ.

Формы касавага пляну можна атрымаць у крэдпляновым аддзеле Менскага Аддзяленьня Дзяржбанку.

Дзяржбанк.

На падставе пастановы Саўнаркому Беларусі ад 3 чэрвеня г. г.

Беларуская Дзяржаўная С.-Г. Акадэмія імя Кастрычнікавай Рэвалюцыі і Беларускі Дзяржаўны Зооінстытут РЭАРГАНІЗУЮЦЦА У АСОБНЫЯ СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ ІНСТЫТУТЫ

Дырэкцыя Акадэміі і Зооінстытуту зварачваецца да ўсіх дзяржаўных, каапэрацыйных, грамадзкіх арганізацый, устаноў, прадпрыемтв і асоб, маючых тыя ці іншыя

ГРАШОВЫЯ ПРЭТЭНЗІІ,

павінны прад'явіць іх да 30 чэрвеня 1931 г.

У выпадку непрад'яўленьня к вызначанаму тэрміну сваіх прэтэнзій да рэарганізуемых Акадэміі і Зооінстытуту, такавыя пасьля гэтага тэрміну ПРЫМАЦЦА НЯ БУДУЦЬ.

Камісія па рэарганізацыі.

ВІЦЕБСКІ Індустрыяльна-Пэдагагічны Інстытут

АБВЯШЧАЕ ВАСЕНЬНІ НАБОР студэнтаў на наступныя аддзяленьні:

I. Па дзённаму інстытуту.

1. Фізыка-Тэхнічнае Аддзяленьне а) беларуская сэкцыя б) яўрэйская сэкцыя.
2. Хэміка-Тэхналягічнае Аддзяленьне а) беларуская сэкцыя б) яўрэйская сэкцыя.

II. Вячэрняга Інстытуту.

3. Фізыка-Тэхнічнае Аддзяленьне а) беларуская сэкцыя
4. Хэміка-Тэхналягічнае Аддзяленьне а) беларуская сэкцыя б) яўрэйская сэкцыя.

Заявы прымаюцца з 1-га чэрвеня па 15-га ліпеня з дакумантамі вызначанымі ў даведніку для асоб жадаючых паступіць у навуч. ўстановы БССР.

Аб часе іспытаў і заняткаў будзе паведамлена дадаткова. Пераважная большасьць студэнтаў дзённага інстытуту забясьпечва цца інтэрнатамі і стыпэндыяй.

Дырэктар Пэдінстытуту АЛЯДА.

Да ведама гарадзкіх і раённых Інспэктароў Нарасьветы —) РВК, Гарсаветаў і школ (—

Белдзяржвыдавецтва і Белкаапсаюз

прыступілі да засылкі ў гарады і раёны БССР

ПАДРУЧНІКАЎ, НАВУЧАЛЬНЫХ ПРЫЛАДАЎ, СШЫТКАЎ,

якія прызначаны на 1931-32 навучальны год

ПРЫМЕЦЕ ЗАХАДЫ к таму, каб усе гэтыя падручнікі, навучальныя дапаможнікі і сшыткі, якія будуць паступаць для школ в-раёну, вамі аплачваліся своячасова без усялякай затрымкі

У выпадку несваячасовай аплаты, падручнікі, навучальныя прылады будуць пушчаны ў агульны продаж насельніцтву. Адказнасьць за зрыў снабжэньня школ вашай раённай сеткай будзе ускладзена на Гарсаветы і Раёнкантары.

Нам. Наркома Асьветы БССР Брытвін.

Зам. Кнігасэкцыі Белдзяржвыдавецтва Клейнер.

Дырэктар Бел. Аб'яднаньня кнігапрадаўцоў БССР Баруўскі.

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакуманту 1 р.

Згодна пастановы НКЗ СССР ад 18 мая г. г. і НКЗ БССР за 10-VI г. г. пасада Ўпаўнаважанага Галоўленкому па БССР з 10-VI 1931 г. ЛІКВІДАВАНА і з гэтага часу

АРГАНІЗАВАНЫ:

1. Трэст заводаў па першапачатковай апрацоўцы лёну і канапель (БЕЛЛЁНАПЕНЬКАТРЭСТ).
2. Беларускае Аддзяленьне Лёнаканапляводбуда (Лёнаканапляводбуд).
3. Кантора Ўпаўнаважанага Лёнаканапляводсаўгастрэсту (БЕЛЛЁНАКАНАПЛЯВОДСАЎГАСТРЭСТ).

АДРАС ПАКАЗАНЫХ УСТАНОЎ:

МЕНСК, САВЕЦКАЯ ВУЛІЦА, 71.


Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Піян. Вул. 17, першы паверх. Тэлефоны: адказна а рэдактара—7-69, сакратарыя—4-78, сэкцыяў—6-15. Выдавецтва—2-44
падпісная плата: 1 месяц—90 к., 3 м-цы—2,70, 6 м-ца —4,00, на год—8,00

Галоўлітбел № 598. Друкарня імя тав. СТАЛІНА.

ПРЭЗЫДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ